ЯК ГАДАВАЦЬ АЛЬФА-ПАКАЛЕННЕ ДЗЯЦЕЙ





КАКЕДАМА І РАСЛІННЫ ІНТЭР'ЕР У КВАТЭРЫ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 КРАСАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 60 (29429)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана ЛЮБЕЦКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў:**

*«Як паказаў аналіз прапаноў і зваротаў, якія паступілі, а таксама вынікі абмеркаванняў на дыялогавых пляцоўках, на сёння ёсць ключавыя пытанні, якія вельмі цікавяць членаў нашага грамадства, і, натуральна, яны падлягаюць дбайнаму аналізу, паколькі Канстытуцыя — светапоглядны дакумент, і асноўныя палажэнні заканадаўства рэалізуюцца на яе падставе. Гэта пытанні, якія ўзнімаліся ў зваротах з самых розных сфер жыцця: сям'і, узаемадносін асобы і дзяржавы, прававой абароны чалавека, пытанні ўласнасці, працаўладкавання, абароны замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. Гэта такі комплексны погляд на сённяшняе жыццё, якім яно павінна быць заўтра».*

# Крынічны бярозавік



У Крынічанскім лясніцтве Мазырскага доследнага лясгаса гэтымі днямі пачалася нарыхтоўка бярозавага соку. За сокавы перыяд (а ён звычайна доўжыцца два-тры тыдні) тут запланавана нарыхтаваць сем тон вітаміннага напою. Ужо дзявяты год гэтай далікатнай вяснова-бярозавай справай даручана займацца **лесніку Мікалаю ШАХЛАНУ:** на лясной дзялянцы, якая ў будучыні пойдзе пад высечку, ён выбраў адпаведныя дрэвы, зрабіў тэхналагічныя насечкі для латкоў, паставіў спецыяльныя поліэтыленавыя пакеты-мяшкі. І першыя струмені соку вольна пацяклі ў тару.

— У асноўным мы рэалізоўваем сок для насельніцтва — для мазыран, жыхароў пасёлка Крынічны, навакольных населеных пунктаў — яны ўжо чакаюць, званяць у лясніцтва, пытаюцца, калі можна прыязджаць. Бяруць і па сорак літраў і нават па сто, — кажа Мікалай Шахлан.

Малады ляснік — сам сын лесніка: бацька Мікалая таксама шмат гадоў служыў лесу, відома, займаўся і нарыхтоўкамі соку. Цяпер Шахлан-малодшы працягвае справу, якую засвоіў з маленства. Сваіх дзяцей ён таксама знаёміць не толькі з прыродай і лесамі, але і з лесніковай працай. Яго малодшая дачка Маргарыта *(на фота)* у захапленні ад вясновага лесу, тым больш што яна першы раз трапіла на бярозавую дзялянку.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **У Брэсцкай вобласці ранніMі збожжавымі засеялі больш за чвэрць плошчаў.**
- МАРТ падаўжае рэгуляванне цэн на сацыяльна значныя тавары.
- **У «Берастаўцы» пачалі ўстаноўку аўтаматызаванай сістэмы распазнання нумароў.**
- «Белмедпрэпараты» выпусцяць першую прамысловую партыю вакцыны «Спадарожнік V» у сярэдзіне красавіка.
- **ФПБ: па калектыўных дагаворах работнікам выплацілі за год больш чым Br2,7 млн.**

ISSN 1990 — 763X

21060

Камунальныя стасункі

## ГАЗ І СВЯТЛО НА ДАЧЫ — РАСКОША?

### Не для пенсіянераў, ільготнікаў і інвалідаў і ў межах дазволенага аб'ёму

**Крадзеж электрычнасці ў садовых таварыствах і дачных кааператывах і зрыванне пломбаў з лічыльнікаў газу — дрэнныя спосабы сэканоміць на плаце за святло і газ, упэўнены эксперты. Яны параілі, як можна аддаваць за балон газу не 46,5 рубля, а 19,5, і абазначылі шляхі, каб не плаціць за тэхналагічна страчаную электрычнасць.**

### НА ЎСЮ МОЦ

У Беларусі 1872 садовыя таварыствы газіфікаваны звадкаваным газам (у 50-літровых балонах), якія спажывае каля 50 тысяч прыватных асоб. 449 садовых таварыстваў краіны (10,5 тысячы чалавек) карыстаюцца прыродным газам. Летась і ў пачатку гэтага года збояў у пастаўцы газу ў садовыя таварыствы па краіне ў цэлым не назіраецца. А вось з боку спажыўцоў, на жаль, пачасціліся выпадкі ўмяшання ў сістэму ўліку расходу газу (лічыльнікаў) — абаненты зрываюць пломбы і лезуць у лічыльны механізм з вядомай мэтай — сэканоміць, заўважыў **Уладзімір ЗАВАЛЬНІКАЎ, начальнік упраўлення газазабеспячэння і маркетынгу аб'яднання «Белпалівагаз»:**

— Такія факты караюцца згодна з законам. Летась выкрыты 184 выпадкі ўмяшання ў лічыльнікі, з іх 159 — менавіта зрыванне пломбы і самастойная яе замена. За 2020-ы за такія несанкцыянаваныя ўмяшанні было спагнана 1,9 мільёна.

СТАР. 3

Па палічках

## ТРАНСПАРТНЫ ПАДАТАК: ХТО, КОЛЬКІ І КАЛІ ПАВІНЕН ЗАПЛАЦІЦЬ

### Новы збор вызваліць вуліцы нашых гарадоў ад старых машын?

**Як вядома, з пачатку гэтага года ў нашай краіне ўведзены транспартны падатак, плацельшчыкамі якога прызнаюцца, у прыватнасці, фізічныя асобы. Грамадзяне, зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, таксама з'яўляюцца плацельшчыкамі транспартнага падатку. Пры перадачы транспартнага сродку ў фінансавую арэнду (лізінг) плацельшчыкам падатку прызнаецца лізінгаатрымальнік. Аб'ектам падаткаабкладання транспартным падаткам з'яўляюцца транспартныя сродкі, зарэгістраваныя за фізічнымі асобамі ў ДАІ МУС.**



Аб гэтых і іншых нюансах новага збору расказалі **начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ і першы намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Вадзім ГАРКУН.**

СТАР. 4

Парламенцкі дзённік

# Канстытуцыйная рэформа, дзяржаўная бяспека і эканоміка

## Уладзімір Андрэйчанка абазначыў перад дэпутатамі асноўныя кірункі іх дзейнасці ў найбліжэйшы час

**Арыенцір работы парламентарыяў быў зададзены на VI Усебеларускім народным сходзе, нагадаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на пасяджэнні Савета ніжняй палаты, якое прайшло за два дні да адкрыцця пятай сесіі сёмага склікання.**

### ПРАПАНОВЫ ПРЫМАЮЦЦА

«Перш за ўсё гэта ўдзел у рабоце па змяненні Асноўнага Закона краіны, — падкрэсліў ён. — Ключавая роля ў гэтым пытанні належыць створанай Указам Прэзідэнта Канстытуцыйнай камісіі. У яе склад увайшлі пяць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў».

Дадаткова ў ніжняй палаце з ліку дэпутатаў і работнікаў сакратарыята сфарміравана рабочая група для акумулявання прапаноў дэпутацкага корпуса па канстытуцыйным рэфармаванні, дадаў спікер.

У Палаце прадстаўнікоў ужо падрыхтаваны для разгляду на вясновай сесіі блок законапраектаў, якія накіраваны на гарантаванне грамадскай бяспекі, супрацьдзеянне праявам дэструктыўнай актыўнасці і скажэнню гістарычнай праўды, паведаміў Уладзімір Андрэйчанка. «Гэта, у прыватнасці, ініцыяваны дэпутатамі праект закона аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму, законапраекты па пытаннях крымінальнай адказнасці, органаў унутраных спраў, абароны службовых асоб, сродкаў масавай інфармацыі, масавых мерапрыемстваў, працоўных адносін, электрасувязі, супрацьдзеяння экстрэмізму», — пералічыў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Асаблівую ўвагу, па яго словах, належыць аддаць Кодэксу аб адукацыі, які ўжо знаходзіцца ў парламенце і ў найбліжэйшы час будзе разглядацца ў першым чытанні.

Новы Кодэкс аб адукацыі **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК** назваў рамачным дакументам, які адлюструе змены, прадыктаваныя жыццём.

«Гэта змены ў вышэйшай школе, тэзіс аб абавязковай сярэдняй адукацыі. Павышаецца роля педагагічнага савета ў прыняцці рашэнняў на ўзроўні ўстановы адукацыі — гэта вельмі важна, — лічыць ён. — Удакладнены і канкрэтызаваны паняцці, што такое дзіцячы садок, школа, універсітэт і г. д. Выразна прапісана, што яны з'яўляюцца ўстановамі адукацыі. Цяпер ніхто, ніякія самазванцы не будуць называць сябе школай, інстытутам, універсітэтам, акадэміяй».

### ЗАХАВАЦЬ ЭКАНОМІКУ

Праз прызму праграмных дакументаў краіны павінен быць разгледжаны блок законапраектаў у эканамічнай сферы, падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. Ён запатрабаваў завяршыць работу над праектам закона аб самарэгулюемых арганізацыях, з прыцягненнем прадстаўнікоў бізнесу дапрацаваць законапраект аб інвестыцыях, вяртанні банкаўскіх укладаў.

«У найбліжэйшыя месяцы павінны паступіць таксама праекты, якія актуалізуюць банкаўскі кодэкс, заканадаўства аб рынку каштоўных папер, аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання, ліцэнзаванні, аб банкруцтве. Гэта дакументы вельмі важныя, і яны павінны забяспечыць нарошчванне эканамічнага патэнцыялу Беларусі, паляпшэнне дзелавога асяроддзя», — сказаў старшыня ніжняй палаты.

Парламентарыям ужо зараз трэба падключыцца да работы над рэспубліканскім бюджэтам на 2022 год і змяненнямі ў падатковым заканадаўстве, дадаў ён. «Я ўчора з міністрам фінансаў казаў пра гэта, і ён прасіў, каб дэпутаты (не толькі члены міжведамаснай рабочай групы, але і іншыя) падключаліся да гэтай работы, выходзілі на профільнае міністэрства і працавалі са сваімі выканкамамі», — перадаў кіраўнік парламента.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцін СЕМЯНЯКА** назваў журналістам канкрэтныя лічбы: «У цяперашні час у Палаце на разглядзе знаходзіцца 25 законапраектаў, 18 з іх будуць уключаны ў прыкладны графік работы. Ужо гатовыя да разгляду 11, над астатнімі работа працягнецца».

### НЕ ТОЛЬКІ ЗАКОНЫ

Ужо распачата, па словах старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі, работа па падрыхтоўцы законапраектаў заканадаўчых актаў на наступны год. Гэта добрая магчымасць для рэалізацыі дэпутацкіх заканадаўчых ініцыятыў, лічыць ён, але ўсе прапановы павінны ўсебакова прапрацоўвацца, пачынаючы з абгрунтавання і канцэпцыі і заканчваючы наступнымі ўзгадненнямі. У якасці добрага прыкладу ён прывёў ініцыятыву Камісіі па адукацыі, культуры і навуцы акрамя парламенцкіх слуханняў па адукацыйнай праблематыцы арганізаваць у канцы красавіка слуханні на тэму «Тэрытарыяльная цэласнасць і народнае адзінства Беларусі: гісторыка-прававыя аспекты ўз'яднання заходніх беларускіх зямель у складзе БССР».

Спікер нагадаў Камісіі па міжнародных справах і дэпутатам — членам Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі пра падрыхтоўку да міжнароднай канферэнцыі па пытаннях супрацьстаяння знешнім выклікам і пагрозам і захавання гістарычнай памяці. Канферэнцыя запланаваная на май.

Адным з ключавых кірункаў работы дэпутацкага корпуса Уладзімір Андрэйчанка назваў вырашэнне праблем сваіх выбарчых акруг і выбаршчыкаў. «Трэба працягнуць дэпутацкі кантроль за цэнаўтварэннем, асабліва сацыяльна значных тавараў, лекавых сродкаў, забяспечыць эфектыўны фільтр на шляху неапраўданага павышэння цэн, — дадаў ён. — Важны таксама ўдзел дэпутатаў у прадаўжэнні грамадскага дыялогу, тлумачальнай работы, трэба выкарыстоўваць для гэтага ўсе магчымыя пляцоўкі, праводзіць сустрэчы з працоўнымі калектывамі, моладдзю».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# Справа ад душы і дзеля людзей

**Дзяржава гатовая дапамагаць установам і працоўным калектывам, якія займаюцца стваральнай працай. Пра гэта заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА падчас наведвання Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій.**

«Пабыўшы ў вас і ў іншых калектывах, пераконваешся, што людзі жывуць будучым, не толькі сённяшнім, — перадае словы Ігара Сергеенкі БелТА. — Людзі займаюцца стваральнай працай. Яны жывуць, бачаць пэўныя праблемы і вырашаюць іх. Не толькі ставяць, але і самі штодзённай працай іх вырашаюць. Вось гэта самае выдатнае».

Ігар Сергеенка адзначыў, што цэнтр — вядучая медустанова ў сістэме пераліванavailability ня крыві, вытворчасці прэпаратаў з крыві. Нават ва ўмовах няпростай эпідабстаноўкі мінулага года цэнтр працягваў развівацца і выканаў усе задачы, якія стаялі перад ім: наладжана работа з донарамі, не было перабояў з пастаўкамі плазмы і кампанентаў крыві ў медустановы. Акрамя таго, развівалася навука. Адзін з першых у свеце беларускі цэнтр стварыў імунную плазму антыCOVID-19 для лячэння ад каранавіруснай інфекцыі.

У час размовы з працоўным калектывам кіраўніка Адміністрацыі папрасілі аказаць садзейнічанне ў актывізацыі работы над новым праектам закона аб донарстве крыві і яе кампанентаў. Па словах супрацоўнікаў цэнтра, дакумента вельмі чакаюць і самі донары, і спецыялісты гэтай сферы. Ігар Сергеенка падкрэсліў, што работа па падрыхтоўцы законапраекта была неапраўдана зацягнута, яе трэба актывізаваць.

Дзяржаўны інтарэс

# УСТАНОВА ДЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ ЭЛІТЫ

## Пытанні дзейнасці Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка разгледзелі на пасяджэнні назіральнага савета, які прайшоў у сценах Міністэрства адукацыі

**У гэтай установе новага тыпу рэалізоўваецца адукацыйная праграма дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі, накіраваная на выяўленне і развіццё ў вучняў здольнасцяў да навукова-даследчай і вынаходніцкай дзейнасці. У рамках кожнай змены навучанне праходзяць 30 школьнікаў 9—11 класаў з усіх рэгіёнаў краіны.**

Для забеспячэння функцыянавання дзіцячага тэхнапарка прадугледжваецца будаўніцтва трох аб'ектаў, у тым ліку вучэбна-лабараторнага корпуса, за кошт сродкаў інавацыйнага фонду горада Мінска, школы і інтэрната на 300 месцаў на раўнадолевых умовах бюджэту сталіцы і рэспубліканскага бюджэту, вылучанага ў рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы.

Плануецца, што рэалізацыя адукацыйнай праграмы будзе ажыццяўляцца па 15 профілях, якія адпавядаюць інавацыйным кірункам развіцця тэхнікі і тэхналогій: гэта «Авіякасмічныя тэхналогіі», «Архітэктура і дызайн», «Біятэхналогіі», «Віртуальная і дапоўненая рэальнасць», «Зялёная» хімія», «Інжынерная экалогія», «Інфармацыйныя і камп'ютарныя тэхналогіі», «Інфармацыйная бяспека», «Лазерныя тэхналогіі», «Машыны і рухавікі. Аўтамабілебудаванне», «Нанаіндустрыя і нанатэхналогіі», «Прыродныя рэсурсы», Робататэхніка», «Электроніка і сувязь» і «Энергетыка будучыні».

Выступаючы на пасяджэнні назіральнага савета, **намеснік прэм'ерміністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** адзначыў: «Пытанні дзейнасці дзіцячага тэхнапарка ў перыяд яго функцыянавання ў рэжыме апрабацыі, а таксама крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці работы, асноўныя задачы і планы на найбліжэйшую перспектыву мы абмяркоўвалі на нарадзе ў прэм'ерміністра. Гэтым аспектам удзялялася ўвага і на іншых нарадах, таму нам неабходна выпрацаваць канкрэтныя прапановы і падыходы па функцыянаванні дзіцячага тэхнапарка, каб не было дубліравання тых структур, якія ў нас ужо створаны і функцыянуюць, каб не было нейкіх дадатковых элементаў падрыхтоўкі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, г. зн. мы павінны зрабіць дзіцячы тэхнапарк унікальнай навучальнай установай, праз якую павінна прайсці ўся наша тэхнічная, творчая падлеткавая і маладзёжная эліта».

— Зараз разглядаецца пытанне ўнясення змен у правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Плануецца, што рашэннем назіральнага савета навучэнцы з дзіцячага тэхнапарка, якія добра сябе праявілі і паказалі пэўны вынік, могуць мець пры паступленні пэўныя прэферэнцыі. Якія менавіта? Пакуль гэта пытанне абмяркоўваецца. Пасля дзіцячага тэхнапарка павінна выбудоўвацца пэўная адукацыйная траекторыя гэтага падлетка, які ў далейшым будзе развіваць свае таленты ўжо непасрэдна, арыентуючыся на нейкую прафесію і спецыяльнасць. Тым больш што адна з галоўных задач дзіцячага тэхнапарка — ранняя прафарыентацыя, дыягностыка схільнасці да тых або іншых відаў дзейнасці, — падкрэсліў **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** — Мы гэтым цяпер займаемся комплексна.

Асаблівая ўвага аддадзена арганізацыі выхаваўчай работы з навучэнцамі дзіцячага тэхнапарка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СААЗ: крыніца каранавіруса ўсё яшчэ не знойдзена



Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) працягвае разглядаць усе магчымыя версіі паходжання каранавіруса, які выклікае захворванне COVID-19. Разам з тым крыніца інфекцыі ўсё яшчэ не знойдзена. Пра гэта заявіў генеральны дырэктар СААЗ Тэдрас Гебрэесус, паведаміла ТАСС. Ён пракаментаваў публікацыю 40-старонкавага выніковага даклада міжнароднай місіі экспертаў пра паездку ў Кітай у студзені-лютым з мэтай высвятлення паходжання ўзбуджальніка COVID-19. «Што датычыцца СААЗ, то ўсе гіпотэзы застаюцца ў сіле. Гэты даклад азначае толькі пачатак шляху. Мы пакуль яшчэ не знайшлі крыніцу гэтага віруса», — канстатаваў эксперт. Кіраўнік СААЗ падкрэсліў, што «высвятленне паходжання віруса патрабуе часу». «Мы абавязаны перад светам знайсці крыніцу, каб калектыўна зрабіць крокі па зніжэнні рызыкі паўтарэння таго, што здарылася», — рэзюмаваў Тэдрас Гебрэесус.

### Міжнародныя донары выдзелілі Сірыі звыш 11 мільярдаў еўра

Міжнародныя донары выдзелілі 5,3 мільярда еўра дапамогі ў выглядзе грантаў сірыйскім супольнасцям і бежанцам, а таксама краінам рэгіёна, якія прымаюць іх. Яшчэ 5,9 мільярда еўра будзе выдзелена ў выглядзе крэдытаў. Пра гэта заявіў еўракамісар па ўрэгуляванні крызісаў Янэз Ленарчыч падчас закрыцця міністэрскай сесіі пятай міжнароднай донарскай канферэнцыі па Сірыі, якая завяршылася ў Брусэлі, паведаміла ТАСС. У ёй узялоўдзел звыш 75 дэлегацый, якія прадстаўляюць 50 краін. Канферэнцыі міжнародных донараў дапамогі Сірыі праводзяцца Еўрасаюзам штогод. Летась такая канферэнцыя дазволіла сабраць каля 7 мільярдаў еўра.

### Паліцыя Мадрыда правяла жорсткія рэйды

Сілавікі правялі серыю рэйдаў супраць падпольных вечарынак у іспанскай сталіцы. Супрацоўнікі праваахоўных органаў прадухілілі больш за 350 незаконных сходаў, арганізаваных у парушэнне ўведзеных абмежаванняў, паведаміў Euronews. У некаторых выпадках паліцэйскія ўрываліся ў прыватныя кватэры і пры гэтым ускрывалі дзверы, выбівалі вокны. Відэазапісы такіх рэйдаў выклікалі вялікі рэзананс у Іспаніі і ўжо прывялі да судовых разглядаў, але суд прызнаў штурм кватэр законным. Урад Іспаніі заклікаў жыхароў краіны выконваць уведзеныя абмежаванні і не парушаць іх.

Перспектыва

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка наведаў ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод».

# УНІКАЛЬНЫ ПРАЕКТ

**Зараз на прадпрыемстве ідзе падрыхтоўка да пусканаладачных работ на ўстаноўках комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў (H-Oil). Гэта самы маштабны праект у інвестыцыйным і вытворчым плане за ўсю больш чым саракагадовую гісторыю прадпрыемства. Ацэначны кошт маштабнага інвестпраекта перавышае 1,4 мільярда долараў. Комплекс (H-Oil) — апошняе слова ў айчыннай нафтаперапрацоўцы. Рэалізацыя праекта дасць магчымасць павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафты да 90 %, што ў сваю чаргу прынясе дадатковую валютную выручку.**



Будаўнічая пляцоўка комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў (H-Oil).

Сёння перад прадпрыемствам пастаўлена задача завяршыць будаўніча-мантажныя работы на новым комплексе (H-Oil) на працягу трох месяцаў. Падчас рабочай паездкі на ААТ «Мазырскі НПЗ» тэмпы рэалізацыі стратэгічнага інвестпраекта і ход фінальных пададных работ на новым комплексе ацанілі **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА і дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** На прадпрыемстве іх сустрэлі **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ, старшыня канцэрна «Белнафтахім» Андрэй РЫБАКОЎ, міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ,** а таксама **старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА і генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі НПЗ» Віталь ПАЎЛАЎ.**

— Комплекс гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў — гэта, па сутнасці, завод у заводзе, ён займае больш за 35 гектараў. Комплекс уключае тры асноўныя ўстаноўкі: гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых рэштаў, вытворчасці вадароду і вытворчасці серы, а таксама 21 аб'ект агульназаводскай гаспадаркі, — прадстаўляюць праект на прадпрыемстве.

На дадзены момант інвестпраект прафінансаваны на 94,4 %, закрыты ўсе пастаўкі асноўнага тэхналагічнага абсталявання, змантаравана больш чым 99 % адзінак абсталявання.

— Гатоўнасць камбінаванай установкі гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў складае 89 %, — звяртае ўвагу кіраўнік прадпрыемства падчас наведвання новага, падрыхтаванага да работы апаратарскага аддзялення комплексу (H-Oil). Зараз вядуцца будаўніча-мантажныя работы, якія звязаны з ліквідацыяй заўваг на тэхналагічных трубаправодах, ідуць выпрабаванні трубаправодаў і абсталявання, выконваюцца электратэхнічныя і ізаляцыйныя работы.

На прадпрыемстве практычна завершаны будаўніча-мантажныя работы на ўстаноўцы вытворчасці серы, тут выконваюцца першыя пусканаладачныя аперацыі. На ўстаноўцы вытворчасці вадароду праведзена комплекснае апрабаванне з выхадам на поўную загрузку і атрыманнем якаснай прадукцыі згодна з патрабаваннямі праекта.

На прадпрыемстве прайшла аператыўная нарада па пытаннях выканання паказчыкаў фінансава-гаспадарчай дзейнасці і завяршэнні мадэрнізацыі завода. Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка звярнуў увагу на тое, што «Мазырскі НПЗ» — унікальнае прадпрыемства:

— Яно ўваходзіць у тройку вядучых нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў на постсавецкай прасторы. З 2005 года тут рэалізаваны шэраг мадэрнізацыйных праектаў. Фактычна гэта паступовае будаўніцтва новых заводаў. Гэты цыкл цяпер завяршаецца ўводам найбольш важнага аб'екта — комплексу гідракрэкінгу, які з'яўляецца абсалютна ўнікальным па тэхналогіях. У свеце не больш за трычатыры падобныя прадпрыемствы, і Беларусь будзе стаяць у гэтым шэрагу. Комплекс знаходзіцца ўжо ў вельмі высокай ступені гатоўнасці. У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта, да лета будаўніча-мантажныя работы павінны быць закончаны і распачата пусканаладка. Гэты комплекс, да якога прыкавана столькі ўвагі, — адна з тэхналагічных жамчужын Беларусі.

Падчас нарады на прадпрыемстве абмяркоўвалі і прычыны адставання ад графіка па некаторых аб'ектах комплексу.

— На гэта ёсць аб'ектыўныя абставіны, таму што праект найскладанейшы. Тут усё абсталяванне ўнікальнага вырабу, пастаўляецца з усяго свету. Дзесьці ліцэнзіяры карэкціруюць тэхналагічныя падыходы, дзесьці ўносяць пэўныя карэктывы праекціроўшчыкі, — растлумачыў прэм'ер-міністр. Ён падкрэсліў, што праект рэалізоўваецца пры адпаведным бізнес-планаванні. Праект акупны і рэалізоўваецца без прыцягнення дзяржаўных сродкаў, а толькі за кошт уласных і пазыковых рэсурсаў.

Варта адзначыць, што падчас рэалізацыі інвестпраекта па будаўніцтве комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў (H-Oil) на прадпрыемстве ўдзялялася вялікая ўвага пытанням падрыхтоўкі і навучання тэхналагічнага персаналу для работы на новым аб'екце.

— Безумоўна, ужо зроблены каласальны крок наперад у плане рэалізацыі гэтага праекта. Апошні крок, як вядома, самы складаны, таму сёння мы ўсе працуем не складаючы рук. Першую прадукцыю на новым комплексе плануем атрымаць ужо ў бягучым годзе, — адзначыў генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі НПЗ».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота БелТА.**

# ГАЗ І СВЯТЛО НА ДАЧЫ — РАСКОША?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Расцэнкі на газ для насельніцтва ў краіне ўстаноўлены пастановай Саўміна № 1166. Парадак разліку за паслугі, а таксама ўмовы паставак прадукцыі рэгулююцца пастановай Саўміна № 571, паведаміла **Вольга ДУЛЬКО, начальнік аддзела цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі эканамічнага ўпраўлення аб'яднання «Белпалівагаз»** і абазначыла кошт блакітнага паліва.

Спажыўцы, якія жывуць у садовых доміках і на дачах, разлічваюцца за паслугі газазабеспячэння па тарыфах, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на аказанне гэтых паслуг. З 1 студзеня 2021-га поўны кошт 1 м$^3$ прыроднага газу — 50,82 капейкі, балон звадкаванага газу вагой 21 кілаграм абыдзецца ў 46 рублёў 50 капеек.

— Паколькі большасць грамадзян, якія жывуць на дачах, — гэта найбольш уразлівыя катэгорыі насельніцтва, з 1 ліпеня 2018-га для некаторых уласнікаў дач і садовых домікаў пры пэўных умовах у межах заканадаўства даецца права платы за звадкаваны і прыродны газ па субсідзіруемых цэнах, — нагадала яна.

## І ПА ЛЬГОТАХ

Правы на зніжаны кошт маюць асобы, якія з'яўляюцца непрацуючымі пенсіянерамі (і дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту); абаненты, што маюць права на льготы згодна з артыкулам 16 Закона аб дзяржаўных сацыяльных льготах; інваліды трэцяй групы.

Каб рэалізаваць права плаціць менш, неабходна выканаць шэраг умоў, падкрэсліла Вольга Дулько:

— Уласнік дачы ці садовага доміка павінен напісаць заяву і мець дакументы, якія пацвярджаюць факт рэгістрацыі па месцы знаходжання. Непрацуючыя пенсіянеры, што дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, павінны прадставіць пенсійнае пасведчанне, працоўную кніжку ці іншы дакумент, які пацвярджае, што пенсіянер не працуе. Асобы, што маюць права на льготы, павінны мець дакументы, якія пацвярджаюць гэтае права, а інваліды трэцяй групы — адпаведнае пасведчанне.

Дакумент, які пацвярджае факт рэгістрацыі па месцы часовага знаходжання, павінен адпавядаць патрабаванням заканадаўства і быць выдадзены органам рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства ці месцы знаходжання. У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу гэта орган унутраных спраў або сельская ці пасялковыя выканкамы ў сельскіх населеных пунктах ці пасёлках гарадскога тыпу, дзе няма органаў унутраных спраў. Пры гэтым меншы тарыф прымяняецца з моманту падачы заявы.

## КОЛЬКІ НАПАЛІЎ — СТОЛЬКІ ЗАПЛАЦІЎ

Пры наяўнасці газавага ацяпляльнага прыбора і прыбора ўліку расходу газу плаціць за яго трэба кожны месяц у залежнасці ад гадавых аб'ёмаў спажывання, якія падлічваюцца нарастаючым вынікам штогод з 1 студзеня.

Адпаведна да 3000 м$^3$ уключна аплачваецца па субсідзіруемых цэнах для насельніцтва. У ацяпляльны перыяд з 1 студзеня да 31 мая кошт за 1 м$^3$ складае 13,66 капейкі. З 1 чэрвеня да 31 снежня — 14,06 капейкі, а летам — 48,40 капейкі.

Пры спажыванні звыш 3000 м$^3$ да 5500 м$^3$ — адносна субсідзіруемых цэн прымяняецца павышаючы каэфіцыент 1,3. Адпаведна, у ацяпляльны перыяд кошт 1 м$^3$ павысіцца да 17,76 капейкі, з 1 чэрвеня да 31 снежня — да 18,28 капейкі, а ўлетку — да 50,82 капейкі.

Усё, што будзе ўжыта звыш 5500 м$^3$, аплачваецца па цане, якая забяспечвае поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат. У ацяпляльны і летні перыяд гэта 50,82 капейкі за м$^3$.

Грамадзяне, якія карыстаюцца звадкаваным газам у балонах (да 21 кг) і маюць права на аплату па субсідзіруемых цэнах, могуць аплаціць пяць балонаў па 19,5 рубля. Калі ім спатрэбіцца больш, то кожны балон абыдзецца ўжо ў 46,5 рубля.

## СВЯТЛО ПАТРАЧАНАЕ І СТРАЧАНАЕ

Садовыя таварыствы (СТ) і дачныя кааператывы (ДК) разлічваюцца за электраэнергію па тых жа тарыфах, што ўстаноўлены для насельніцтва. Сёння 1 кВт·г каштуе 20,92 капейкі. СТ і ДК з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, маюць адасобленую маёмасць і самастойны баланс. Амаль усе яны атрымліваюць электрычнасць ад паветраных ліній электраперадачы магутнасцю 10 кВ, якія знаходзяцца на балансе энергазабяспечваючых арганізацый. Да лініі далучаецца адпайка даўжынёй ад некалькіх дзясяткаў да соцень метраў. У сваю чаргу да яе далучаецца камплектная паніжаючая трансфарматарная падстанцыя (КТП) напружаннем 10 на 0,4 кВ (такіх падстанцый каля 2,5 тысячы па краіне). Пераважна і адпайка, і падстанцыя знаходзяцца на балансе садовых таварыстваў, а разліковы лічыльнік установлены на КТП, паведаміў **Віктар ЖЫТКЕВІЧ, начальнік упраўлення збыту энергіі аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга»:**

— Такі лічыльнік падлічвае сумарную электраэнергію, якую ўжылі ўсе садовыя домікі, і страты энергіі ва ўсіх паветраных лініях па 0,4 кВт, па якіх транспартуецца энергія. СТ павінна дадаткова аплаціць страты электраэнергіі ў адпайцы і сілавым трансфарматары КТП, бо яны знаходзяцца на балансе гэтых арганізацый. А страты электраэнергіі ў іх разліковым электралічыльнікам не ўлічваюцца.

Разлік такіх страт штомесяц робіцца энергазабяспечваючай арганізацыяй па кожным садовым таварыстве, паколькі ў тарыфах на электраэнергію закладзены толькі нарматыўныя страты, тэхналагічны расход на транспарціроўку энергіі ў сетках, якія знаходзяцца на балансе энергазабяспечваючых арганізацый.

— Садаводы часта пытаюцца, ці можна выкарыстоўваць электрычнасць у садовых доміках на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне і аплачваць электрычнасць па нізкіх тарыфах. Аднак яны прадугледжаны толькі для жыллёвага фонду, а домікі да яго не адносяцца, — растлумачыў спецыяліст.

Каб вырашыць праблему крадзяжоў электраэнергіі, як варыянт, прапануецца вынесці лічыльнікі з садовых домікаў за мяжу зямельнага ўчастка. Каб не аплачваць тэхналагічны расход электраэнергіі, трэба перадаць электрасеткі і КТП на баланс энергазабяспечваючым арганізацыям. Тады разліковы ўлік будзе супадаць з мяжой балансавай прыналежнасці электрасеткі, параіў Віктар Жыткевіч.

Цяпер у Беларусі распрацоўваецца праект указа кіраўніка краіны па садаводчых пасяленнях, згодна з якім сеткі энергазабеспячэння напружаннем 0,4 кВт можна будзе перадаваць на баланс энергасістэмы. Пры гэтым сеткі павінны быць у тэхнічна спраўным стане і мець прыдатны нарматыўны тэрмін эксплуатацыі.

**Ірына СІДАРОК.**

# АБМЕЖАВАННІ НА ЛОЎЛЮ РЫБЫ

**З 1 красавіка ў Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях устанаўліваецца забарона на лоўлю ўсіх відаў рыбы, якая працягнецца ў гэтых рэгіёнах да 30 мая.**

Раней, з 20 сакавіка, аналагічная забарона была ўстаноўлена ў рыбалоўных угоддзях Брэсцкай і Гомельскай абласцей, там яна будзе дзейнічаць да 18 мая. У Віцебскай вобласці забарона чакаецца з 10 красавіка да 8 чэрвеня. Такія ахоўныя меры неабходны для стварэння спрыяльных умоў у перыяд нерасту рыбы. У гэтыя ж тэрміны забараняецца здабываць рака вузкапалага.

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, падчас нераставай забароны аматарске рыбалоўства цалкам не забаронена, але істотна абмежавана: рыбачыць можна толькі адной вудай з адным кручком або адным спінінгам, аснашчаным штучнай прынадай, з адным адзінарным або двайным, або трайным кручком у светлы час сутак з берага (без заходу ў ваду) альбо з лёду, са штучных збудаванняў (акрамя пералічаных у абзацы 7 падпункта 109.3 Правіл вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства).

Выкарыстанне любых іншых прылад або спосабаў лоўлі ў перыяд забароны кваліфікуецца як парушэнне і вядзе да накладання штрафу. Прычыненне шкоды на суму 100 (2900 рублёў) і больш базавых велічынь з'яўляецца падставай для распачынання крымінальнай справы. На працягу ўсяго перыяду забароны грамадзянам нельга карыстацца маламернымі суднамі — не толькі для рыбалоўства, але і для іншых мэт. Тэрміны агульнай веснавой забароны перасякаюцца з нераставымі забаронамі, устаноўленымі асобна на некаторыя віды рыбы: шчупака, судака, сома. Такую рыбу, злоўленую ў перыяд забароны на здабычу пэўнага віду, неабходна адпусціць назад у вадаём.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ТРАНСПАРТНЫ ПАДАТАК: ХТО, КОЛЬКІ І КАЛІ ПАВІНЕН ЗАПЛАЦІЦЬ

### Каго гэта не датычыцца?

Плацельшчыкамі транспартнага падатку прызнаюцца фізічныя асобы, на якіх зарэгістраваны ў Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў транспартныя сродкі.

Але ёсць пэўныя выпадкі, калі ў асобных транспартных сродкаў транспартны падатак не збіраецца. Напрыклад, на машыны, якія былі ўкрадзены ва ўладальніка. У гэтым выпадку падатак вам не «выпішуць», але галоўнае, каб факт угону або крадзяжу быў афіцыйна зафіксаваны.

Не будуць выплачваць транспартны падатак уладальнікі транспартных сродкаў катэгорыі M1, M1G (легкавыя электрамабілі і легкавыя электрамабілі павышанай праходнасці), што прыводзяцца ў рух выключна электрарухавіком. Такая льгота дадзена да 31 снежня 2025 года.

Таксама падаткам не абкладаюцца транспартныя сродкі, спецыяльна абсталяваныя для выкарыстання інвалідамі.

Калі аўто прайшло дзяржтэхагляд, атрымала допуск да ўдзелу ў дарожным руху, за яго выплачана дзяржпошліна, тады транспартны падатак будзе налічвацца толькі пасля завяршэння тэрміну дзеяння такога допуску.

Не прызнаюцца прадметам падаткаабкладання транспартныя сродкі, якія маюць год выпуску 1991-ы і раней. Яшчэ адна катэгорыя — машыны, знятыя з уліку да 1 ліпеня 2021 года. На іх нават за некалькі месяцаў валодання ў бягучым годзе не будзе налічвацца транспартны падатак. Пра гэта мы пагаворым больш падрабязна.

### Ад старых машын зараз актыўна пазбаўляюцца

Каля траціны транспартных сродкаў у нашай краіне выпушчана да 1 студзеня 1992 года або падлягае ўтылізацыі. Частку з іх уладальнікі ўжо здымаюць з уліку па спрошчанай сістэме. Вадзім Гаркун адзначыў, што за суткі практычна адна тысяча аўтамашын здымаецца з рэгістрацыйнага ўліку ў сувязі з утылізацыяй:

— Прагназуючы сітуацыю, якая складваецца з улікам змянення падатковага заканадаўства, мы распрацавалі прапановы па спрашчэнні парадку зняцця транспартнага сродку з уліку ў сувязі з яго ўтылізацыяй. Што накont навін, гэта ўвядзенне нормы, па якой транспартны сродак можна з 1 сакавіка бягучага года зняць з дзяржаўнага ўліку ў Дзяржаўтаінспекцыі па заявіцельным прынцыпе.

Каб зняць з уліку транспартны сродак, аўтаўладальніку неабходна звярнуцца ў ДАІ з адпаведнай заявай. Дзяржаўтаінспекцыя правядзе праверку і пры адсутнасці інфармацыі аб удзеле аўто ў руху на працягу апошніх трох гадоў здыме аўтамабіль па заяве ўладальніка без неабходнасці прад'яўлення якіх-небудзь дакументаў.

Па словах Вадзіма Гаркуна, многія не здымалі з уліку свае аўтамабілі, паколькі не было фактару неабходнасці.

— Не было нормы, якая абавязвала б кіроўцу здымаць транспартны сродак з рэгістрацыйнага ўліку ў сувязі з тым, што ён выбыў з удзелу ў дарожным руху. Акрамя таго, яшчэ не ўсе грамадзяне зразумелі, што валоданне транспартным сродкам — гэта адказнасць. У прыватнасці, у выпадку ДТЗ уласнік транспартнага сродку можа несці ў судзе адказнасць за шкоду, якую аўто нанесла трэцім асобам, — растлумачыў ён. — З улікам дынамічнага развіцця заканадаўства менталітэт насельніцтва стаў мяняцца. Асабліва ў сувязі з увядзеннем адказнасці ўласніка машыны за парушэнне ПДР. Людзі сталі разумець, што штраф за парушэнне хуткаснага рэжыму будзе прыходзіць уладальніку машыны.

Вадзім Гаркун нагадаў, што, згодна з новым заканадаўствам, пералік артыкулаў, за якія прыцягваецца да адказнасці ўладальнік аўтамашыны, пашыраны. Так, з 1 сакавіка з'явілася тэхнічная магчымасць фіксаваць парушэнне за непройдзены тэхагляд.

— Пры сертыфікацыі і апрабацыі адпаведнага абсталявання ў найбліжэйшай перспектыве камеры будуць фіксаваць у аўтаматычным рэжыме праезд на чырвоны сігнал святлафора, рух па паласе грамадскага транспарту, парушэнне правіл манеўравання, размяшчэння на праезнай частцы, — звярнуў увагу прадстаўнік ДАІ.

### Ільготы па падатку ў выглядзе зніжэння стаўкі

Падатковы кодэкс прадугледжвае некалькі выпадкаў, калі стаўка транспартнага падатку паніжаецца. «Калі транспартны сродак зарэгістраваны за інвалідам 1-й або 2-й групы, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, асобай, што дасягнула агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, або асобай, якая мае права на пенсію са зніжэннем такога ўзросту, стаўка падатку памяншаецца на 50 %.

Але такое зніжэнне прадугледжана пры адной важнай умове: у дадзенай фізічнай асобы павінна быць сапраўднае вадзіцельскае пасведчанне адпаведнай катэгорыі. «Напрыклад, калі за пенсіянерам зарэгістраваны легкавы і грузавы аўтамабілі, а ў яго пасведчанне кіроўцы катэгорыі B, то па легкавым транспарце стаўка будзе зніжана на 50 %, а па грузавым паніжана не будзе», — адзначыў Андрэй Кавалеўскі.

Для інвалідаў 3-й групы прадугледжана паніжэнне стаўкі на 25 %, але таксама пры наяўнасці сапраўднага пасведчання кіроўцы адпаведнай катэгорыі.

Поўнае або частковае вызваленне ад выплаты транспартнага падатку на аўто, якое не выкарыстоўваецца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, маюць права атрымаць таксама фізічныя асобы, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Такое вызваленне даецца фізічным асобам мясцовымі Саветамі дэпутатаў або па іх даручэнні выканаўчымі і распарадчымі органамі.

### Стаўкі транспартнага падатку

Памер стаўкі транспартнага падатку залежыць ад дазволенай максімальнай масы (напрыклад, легкавы або грузавы аўтамабіль), ёмістасці транспартнага сродку (напрыклад, аўтобус) альбо вызначаецца за адну адзінку транспартнага сродку (напрыклад, прычэп-дача («караван»), матацыкл, седлавы цягач).

Пры адсутнасці звестак аб дазволенай максімальнай масе транспартнага сродку стаўкі транспартнага падатку ўстанаўліваюцца ў памеры мінімальнай стаўкі такога падатку для адпаведнага тыпу транспартнага сродку.

Напрыклад, за легкавы аўтамабіль, які мае дазволеную максімальную масу не большую за 1,5 тоны, за год трэба будзе заплаціць 61 рубель, а за аўто вагой больш за 3 тоны — максімальная стаўка 223 рублі. Стаўкі на грузавыя аўтамабілі пачынаюцца са 162 рублёў у год (машына максімальнай масай не больш за 2,5 тоны) і даходзяць да 508 рублёў за машыну вагой больш за 12 тон. За аўтобус з колькасцю пасадачных месцаў да 20 уключна трэба будзе аддаць 244 рублі ў год, а за транспартныя сродак, дзе колькасць пасадачных месцаў звыш 40, — 447 рублёў. І яшчэ. За матацыкл у наступным годзе заплацім 41 рубель, а за седлавы цягач — 406 рублёў у год.

### Камусьці трэба плаціць цяпер, але большасці — потым

Андрэй Кавалеўскі нагадаў: транспартны падатак будзе выплачвацца пасля завяршэння каляндарнага года, у тэрмін да 15 лістапада года, наступнага за справаздачным. Гэта значыць, транспартны падатак за 2021 год падлягае выплаце да 15 лістапада 2022 года на падставе паведамлення, якое будуць накіроўваць падатковыя органы да 1 верасня 2022 года.

«Але ў 2021 годзе ўведзена асаблівасць — авансавы плацёж па транспартным падатку. Яго будуць уносіць тыя плацельшчыкі, у якіх на 1 студзеня 2021 года адсутнічаў дазвол на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху, па якім раней была выплачана дзяржпошліна. Яны будуць абавязаныя да 15 снежня на падставе паведамлення падатковага органа заплаціць авансавы плацёж па транспартным падатку», — паведаміў прадстаўнік МПЗ.

Стаўкі авансавага плацяжу фіксаваныя, складаюць адну базавую велічыню за аўтамашыну (цяпер 1 БВ — 29 рублёў), за матацыкл і прычэп — 20 рублёў. У наступным годзе такія плацельшчыкі правядуць даплату транспартнага падатку да агульнаўстаноўленых ставак.

Паводле яго слоў, транспартны падатак будзе выплачвацца па такой жа схеме, як і падатак на нерухомасць, па паведамляльным прынцыпе.

Андрэй Кавалеўскі ўдакладніў, што падатковыя органы будуць прымяняць тры віды апавяшчэння аб выплаце транспартнага падатку: асабістае, паштовым адпраўленнем і з дапамогай электроннай сувязі. Па яго словах, апошні выгляд апавяшчэння будзе ажыццяўляцца праз асабісты электронны кабінет падаткаплацельшчыка. Разам з тым ён растлумачыў, што наяўнасць такога кабінета — не абавязковая норма.

### Падатак на перасячэнне мяжы

Што датычыцца падатку на перасячэнне Дзяржаўнай граніцы, яго памер будуць вызначаць мясцовыя ўлады. Абласным Саветам дэпутатаў дазволілі спаганяць збор за перасячэнне мяжы на аўтамабілі. Гэта рашэнне, калі яно будзе прынята, закране тыя транспартныя сродкі, маса якіх не перавышае пяці тон. Сума збору не павінна перавысіць тры базавыя велічыні — гэта значыць 87 рублёў.

### Пра базу даных аўтамабіляў

Адказваючы на пытанне аб тым, ці валодаюць падатковыя органы інфармацыяй аб зарэгістраваных аўтамабілях на канкрэтных уладальнікаў, прадстаўнік МПЗ растлумачыў, што звесткі аб тэхаглядзе, наяўнасці аўтамабіляў і гэтак далей будуць падаваць у рамках сваіх кампетэнцый МУС і «Белтэхагляд».

Паводле яго слоў, ужо вядзецца работа па стварэнні такой базы даных, куды будзе сабрана інфармацыя з трох ведамстваў: падатковага, МУС і «Белтэхагляда».

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# БЯСПЕЧНЫ ПАТРУЛЬ

**На Гомельшчыне стартавала акцыя «Бяспечны патруль». Незвычайны гульнявы квэст, які навучыць дзяцей бяспечным паводзінам на дарогах, правялі супрацоўнікі аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама і абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі.**



Да ўдзелу ў пазнавальным мерапрыемстве запрасілі навучэнцаў розных устаноў адукацыі ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў. Дзяцей чакала інтэрактыўная праграма з гульнявым полем памерам тры на шэсць квадратных метраў. Яна распрацавана Дзяржаўтаінспекцыяй і вучыць бяспечным паводзінам на дарозе.

— Дзецям было прапанавана выбраць бяспечную дарогу ад дома да школы. Каб гэта зрабіць, удзельнікі павінны былі выканаць розныя заданні, кожнае з якіх адрознівалася крэатыўным падыходам да тэмы бяспекі. Так, наведаўшы станцыю «Банк», навучэнцы сумесна з педагогам вывучалі сховішча ведаў пра правілы паводзін на дарозе. На станцыі «Школа» дзеці збіралі мазаіку, у якой «хаваўся» знак дарожнага руху. На станцыі «Дом» удзельнікі адгадвалі музычныя загадкі па правілах дарожнага руху, а станцыя «Універсітэт» дазволіла школьнікам нават вучыць дарослых: дзеці стваралі для бацькоў новыя знакі дарожнага руху, — растлумачыла арганізатар мерапрыемства, **начальнік аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Кацярына РАДЗІВОНАВА.**

Між тым бяспечны шлях ад дома да школы прайшла кожная з дзесяці камандаў.

На вясновых канікулах на Гомельшчыне адкрыта каля 380 аздараўленчых лагераў з дзённым знаходжаннем. Плануецца, што прышкольныя лагеры будзе наведваць каля васьмі з паловай тысяч дзяцей.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама.**

На слыху

## Сітуацыя з вадой у Бешанковічах пад кантролем

**Вельмі рэзанансной стала інфармацыя пра камунальную аварыю ў Бешанковічах: на вуліцы Маладзёжнай у ноч з 29 па 30 сакавіка вада, якую набіралі ў кватэрах з кранаў, не была прыдатная для ўжывання.**

Як паведамілі ў райвыканкаме, сітуацыя пад кантролем. Паводле звестак на раніцу 31 сакавіка, згодна з вынікамі проб вады ў мікрараёне вуліцы Маладзёжнай у райцэнтры, патагенная мікрафлоры, якая выклікае сальманелёз альбо дызентэрыю, не выяўлена. Праводзіцца пашыранае даследаванне вады на вызначэнне наяўнасці вірусаў і іншай мікрафлоры.

А пакуль спецыялісты санітарнай службы рэкамендуюць не выкарыстоўваць водаправодную ваду для піцця. Да дамоў арганізаваны падвоз пітной вады.

«Па факце здарэння праводзіцца эпідэміялагічнае расследаванне. Шэсць дзяцей знаходзяцца ў стацыянары, іх стан здавальняючы», — адзначылі ў райвыканкаме. Прычыны надзвычайнага здарэння ўдакладняюцца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Ну і ну!

## «Мініраванне» дзеля знаёмства

**Днём у дызель-цягніку "Ліда — Гродна" 17-гадовай першакурсніцы ВНУ ў сацсетку прыйшло паведамленне ад незнаёмца: «Бяспека гэтага саставу залежыць толькі ад цябе... Выбух адбудзецца праз 19 хвілін».**

Дзяўчына спалохалася і звярнулася да нарада суправаджэння. Як паведамляе МУС, цягнік экстранна спынілі і выклікалі на месца сапёрна-піратэхнічную групу. Састаў абследавалі — выбухованебяспечных прадметаў не знайшлі. Затрымка руху склала крыху больш за дзесяць хвілін.

Супрацоўнікі Гродзенскага АУС на транспарце аператыўна ўстанавілі аўтара паведамлення: 17-гадовы жыхар Скідзеля знаходзіўся ў тым жа вагоне. З яго слоў, такім чынам ён хацеў пазнаёміцца са студэнткай. Следчыя распачалі крымінальную справу за заведама ілжывае паведамленне аб небяспецы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Сямейная газета

Выпуск № 6 (165)

# У ЧАКАННІ ВЯЛІКАДНЯ

Сёлета каталікі адсвяткуюць Вялікдзень амаль на месяц раней, чым праваслаўныя. Дзіўна, але некаторых гэта моцна непакоіць. Што да мяне, дык такая разбежка ў святах нават на карысць. Справа ў тым, што ў нас на дваіх з мужам — пяцёра хрэснікаў. Двое з іх праваслаўныя, астатнія — каталікі. І мы, як сумленныя хросныя бацькі, кожны Вялікдзень спяшаемся іх наведаць. Вядома, дзеці не столькі чакаюць нашага візіту, колькі падарункаў.

Дагадзіць сучасным дзецям — справа складаная, ды, прызнацца, нятанная. Акурат на днях патэлефанавала маці Марыначкі. Але нават яна не змагла мне адказаць на пытанне, што купіць яе дачцэ. Цацкамі, маўляў, дзяўчынка ўжо не цікавіцца (а ёй, між іншым, нядаўна споўнілася толькі сем гадкоў!), адзенне падбіраць трэба, бо фігура ў дзіцяці нестандартная. Падарункамі для старэйшых хрэснікаў я ўвогуле моцна азадачана. Больш за тое, наведаць усіх за адзін дзень (яшчэ пашанцавала, што жывуць у адным горадзе!) — той яшчэ квэст. Добра было б і вярнуцца дамоў не зацемна — у нашага сына таксама ёсць хросныя бацькі, якія, хутчэй за ўсё, захочуць да яго прыехаць. Вось і кажу: выдатна, што велікодныя святы сёлета не прыйшліся на адзін час.

Раней такой праблемы не было. У нашай сям'і хрысцілі дзяцей, у асноўным цёткі ды дзядзькі. Спецыяльна ніхто ні да каго не ездзіў — пакуль быў жывы дзед, усе сваякі, дзе б яны ні знаходзіліся, на каталіцкі Вялікдзень збіраліся ў адной маленькай хатцы ў такой жа невялічкай вёсцы Шпількі, што раскінулася амаль на мяжы Лідскага і Шчучынскага раёнаў. Збіраліся рана (не дай бог было спазніцца!), з'ядалі свянцонае (так у каталікоў называюць асвечанае) яйка, елі прыгатаваныя напярэдадні стравы (было надзвычай смачна, бо перад гэтым пасціліся), спявалі песні, качалі яйкі, спаборнічалі ў біцці галоўнага сімвала свята. І ніхто не тлуміў галаву наконт падарункаў: што падарылі хросныя бацькі, таму дзеці і былі рады.

Праваслаўны Вялікдзень мы адзначалі дома: каталік у нас толькі бацька, а мама, брат і я ахрышчаныя ў праваслаўі. Напярэдадні фарбавалі яйкі, якія разам з кавалачкам хлеба і невялічкім слоікам з соллю клалі ў кошычак і везлі на асвячэнне ў царкву. Часта мы з мамай заставаліся на ўсяночную (так у нас называюць ноч, калі, згодна з Бібліяй, адбываецца Уваскрэсенне Хрыста). Раніцай быў святочны сняданак, увесь дзень быў напоўнены нейкімі нябачнымі ўрачыстасцю і спакоем. Я не помню, каб на праваслаўнае свята мы ездзілі да матуліных бацькоў, не з'яўляліся ў гэты дзень і яны: бабуля-настаўніца, якая ўсё жыццё бясспрэчна падпарадкоўвалася савецкім законам, нават пасля зняцця забароны верыць у Бога хрысціянскіх свят не прызнавала. Дзякуй маме, якая, нягледзячы на сваё «бязбожнае» дзяцінства, у свой час прывяла нас з братам да храма і зрабіла ўсё магчымае, каб духоўнасць для нас была не проста прыгожым словам.

Гэта толькі апошнім часам на Вялікдзень у нас мітусня: рыхтуемся да свята, абавязкова ідзём у храм, імкнёмся наведаць бацькоў, едзем да ўсіх пяцярых хрэснікаў, чакаем гасцей у сябе. Летась каранавірусная інфекцыя ўнесла свае карэктывы. Затое, нікуды не спяшаючыся, правялі свята ў вузкім коле самых родных. Сёлета, відаць, будзе па-іншаму: пандэмія — пандэміяй, а дзеці чакаюць падарункаў...

**Вераніка КАНЮТА.**

Тыя, хто побач

# Людміла і Вячаслаў СЯРГЕЕВЫ: шматдзетныя бацькі аднаго спартсмена



Максім СЯРГЕЕЎ.

**Імклівасць, хуткасць, палёт, надзейнасць, сяброўства, каханне — гэта ўсё аб шорт-трэку — бадай ці не самым сямейным відзе спорту ў Беларусі. У Віцебску працуе трэнерская сям'я Ліліі і Аляксандра Антоненкаў, іх дзеці таксама ў гэтым спорце. У Магілёве шорт-трэк развіваюць Генадзь і Таццяна Болгавы, чый старэйшы сын займаецца канькабежным спортам, а малодшы сын і дачка — шорт-трэкам. Людміла і Вячаслаў Сяргеевы стварылі не проста спартыўную сям'ю, а сапраўдную дынастыю. Бацькі падрыхтавалі сына Максіма да дзвюх алімпіяд і мноства міжнародных спаборніцтваў. Зараз муж і жонка разам трэніруюць маладых спартсменаў у Жодзіне. Як жыве спартыўная дынастыя, Людміла і Вячаслаў Сяргеевы расказалі «Сямейнай газеце».**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Абмяркуем?

# Ключ з правам перадачы

## Як у новай лічбавай рэальнасці бабулям і дзядулям знаходзіць агульную мову з унукамі і заставацца для іх апорай і падтрымкай?

**Мяняецца свет — мяняюцца і нашы адносіны з людзьмі, у тым ліку самымі блізкімі. Ці ствараюць інфармацыйныя тэхналогіі праблемы ў зносінах бабуль і дзядуляў з унукамі? Чаму пажылым людзям важна ісці ў нагу з часам? Хто больш паспяхова навучае пажылых валоданню камп'ютарам і гаджэтамі: іх равеснікі або моладзь?**

**Пра гэта — наша размова з псіхолагам Таццянай ІЛЮКОВІЧ.**



***— Ёсць пункт гледжання: бабулі і дзядулі традыцыйна разумеюць унукаў лепш, чым бацькі. Згодны з гэтым?***

— Дзеці найбольш прывязаны да тых, хто пра іх клапоціцца і забяспечвае выжыванне. Павышаная трывожнасць або абыякавасць, недахоп увагі прыводзяць да канфліктаў, маніпуляцый, шкодзяць зносінам дарослых і дзяцей. Распаўсюджаны пункт гледжання аб большым разуменні і прыхільнасці ўнукаў да бабуль-дзядуляў тлумачыцца тым, што ў нашай культуры бацькі часта занадта занятыя, каб аддаць дастаткова часу сынам і дочкам. Камунікацыі бабуль-дзядуляў і ўнукаў шмат у чым залежаць ад тых традыцый ва ўзаемаадносінах, якія закладваліся ў сям'і. Гэта вечная праблема. Калі паміж рознымі пакаленнямі існуе павага, разуменне, удзел, добразычлівасць, нярэдка менавіта бабулі і дзядулі паведамляюць простыя правілы ўзаемадзеяння са светам. Сам па сабе факт нараджэння ўнукаў не азначае, што вы сталі бабуляй або дзядулем. Трэба прыкласці пэўныя намаганні і «вырасціць» сябе для гэтай новай сацыяльнай ролі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Справы духоўныя

# Палатно як люстэрка душы

## Навошта манастыру студыя выяўленчага мастацтва?



**У вёсцы Гнесічы Навагрудскага раёна адраджаецца адзін з самых старажытных духоўных цэнтраў Беларусі — Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр. Ён быў заснаваны ў 1225 годзе, дзейнічаў да ваеннага 1915 года і быў адноўлены ў 2007-м. Манастыр хутка вяртае сваю вядомасць: акрамя аказання духоўнай дапамогі ўсім, хто мае патрэбу, тут вядзецца вялікая асветніцкая і сацыяльная работа — дзейнічаюць нядзельная школа, брацтва, паломніцкая служба, прытулак, аграсядзіба, гасцявы дом; асаблівая дапамога аказваецца сем'ям, якія ўсынавілі дзяцей... Вось ужо пяты год пры манастыры існуе студыя выяўленчага мастацтва «Сугучча». Гэта не зусім звычайнае месца, дзе малююць. Ды і малююць тут не зусім звычайна.**

І тое адразу відаць па работах удзельнікаў. Ёсць меркаванне, што ў іх адлюстроўваецца духоўная энергія гэтага месца. Яшчэ адна асаблівасць «Сугучча» — тут малююць ўсе: і дзеці, і дарослыя, і насельнікі манастыра, і паломнікі, і нават сам ігумен.

Любы манастыр — гэта своеасаблівая лякарня, куды прыязджаюць людзі, якія маюць патрэбу ў духоўнай дапамозе. Па словах ігумена Яўсевія (Цюхлова), працэс малявання дапамагае чалавеку выліць свой боль, які назапашваўся доўгія гады, вызваліцца ад лішняга грузу, пазбавіцца ад перашкод на шляху да светлага жыцця. Гэта адна з прычын стварэння студыі на манастырскім падворку.

— Другая — наяўнасць нядзельнай школы пры манастыры, — распавядае айцец Яўсевій.



Маляванне пад аховай манастыра дазваляе выказаць на паперы ўсё — ад дзіцячых мар да сур'ёзных духоўных перажыванняў.

Пры навучэнні дзяцей маляванню студыя дае магчымасць развіваць іх творчы пачатак. Такога ж прынцыпу прытрымліваўся ў XVIII стагоддзі палітычны і грамадскі дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, ураджэнец гэтых мясцін Антоній Тызенгаўз. Ён стварыў у Гродне музычна-тэатральную школу, куды запрашаў майстроў для навучання дзяцей рамёствам і адначасова грамаце. Цікава, што ў тыя часы матэматыцы аддавалася ў два разы менш часу, чым маляванню. Найперш трэба развіваць асобу і толькі потым пачынаць канкрэтнае навучанне, лічыў Антоній Тызенгаўз. Без унутранага развіцця можна разабрацца ў вышэйшай матэматыцы і ў выніку стаць пасрэдным спецыялістам, бо веды будуць абмежаваныя толькі тым, чаму цябе навучылі, аргументаваў ён.

Маляванне дапамагае раскрываць і іншыя таленты чалавека, пераканаў ігумен Яўсевій.

— Яшчэ адной падставай для адкрыцця студыі паслужыла назіранне за дзецьмі, — распавёў ён. — Падчас малявання на занятках у нядзельнай школе дзеці да хрышчэння выкарыстоўвалі цёмныя тоны фарбаў, а пасля таінства хрышчэння — светлыя.

**Тут малююць усе: і дзеці, і дарослыя, і насельнікі манастыра, і паломнікі, і нават сам ігумен.**

Паслушнік Аляксей жыве ў Лаўрышаўскім манастыры з 2014 года, служыць на кліpace і ў алтары. У вольны час з задавальненнем бярэцца за пэндзлі.

— У дзяцінстве я маляваў. Гэта было некалькі дзесяцігоддзяў таму, — расказаў ён. — Ізноў вярнуўся да любімага занятку тут. Незвычайна, што менавіта пад аховай манастыра ёсць магчымасць засяродзіцца за мальбертам. Мне падабаецца, што даецца поўная свабода: ніякай тэмы! Малюй што хочаш, слухай духоўныя песнапенні ці класічную музыку.

Нярэдка ў манастыр прыязджаюць маладыя людзі, якія з цяжкасцю ўпісваюцца ў соцыум. Яны маюць магчымасць жыць на тэрыторыі манастыра, наведваць Літургію, удзельнічаць у царкоўных таінствах і сваёй работай дапамагаць адраджэнню святыні. Студыя выяўленчага мастацтва — яшчэ адна магчымасць для іх знайсці сябе.

— У наш час людзі раз'яднаныя, некаторыя адчуваюць сябе некамфортна ў грамадстве. Маляванне дапамагае разняволіцца, — лічыць Аляксей. — Гэта своеасаблівая арт-тэрапія.

Звычайна ён малюе прыроду. Асабліва яму падабаецца маляваць неба, але аднойчы на яго палатне з'явіўся касмічны карабель у форме храма.

«Таму што Царква — гэта, вобразна кажучы, карабель, дзе сам Хрыстос — рулявы, — растлумачыў Аляксей. — Яшчэ гэта мара аб перамозе веры».

Гісторыя іераманаха Яўціхія ў частцы, якая датычыцца ролі выяўленчага мастацтва, падобная. Да служэння ў Свята-Елісееўскім Лаўрышаўскім манастыры яму таксама не ўдавалася рэалізаваць сваё даўнейшае жаданне маляваць. Тут шматгадовае імкненне ажыццявілася праз мноства работ.

— Маляванне ў сценах манастыра дае своеасаблівую духоўную ахову і магчымасць выказаць свой унутраны свет, — лічыць іераманах. — Аднойчы на Светлым тыдні, калі душа радуецца, узносіцца, захацелася стварыць кампазіцыю, у якой ёсць вобраз манаха. Памятаю натхненне і светлыя пачуцці, якія ахапілі мяне падчас гэтай работы...

Студыя «Сугучча» дае ўнутраны штуршок чалавеку, які шукае адказы на адвечныя пытанні, паказвае кірунак і дапамагае не збіцца са шляху, лічаць яе ўдзельнікі.

**Паліна ДЗІСКО.**

# Ключ з правам перадачы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— На ваш погляд, інфармацыйныя тэхналогіі, камп'ютарная культура паглыбілі неразуменне паміж бабулямі-дзядулямі і ўнукамі?***

— Большасць сучаснікаў 40—60 гадоў (а ўнукамі ўпершыню можна абзавесціся ў гэтым узросце) працуюць, уцягнуты ў грамадскае жыццё, свабодна абыходзяцца з гаджэтамі. Так што ў маладых бабуль і дзядуляў рэдка ўзнікаюць канфлікты з унукамі з-за тэхналагічнага адставання. Тым, каму за 60, складаней асвоіць інфармацыйныя тэхналогіі. З гадамі мозг забяспечваецца кіслародам не так актыўна, як раней. Калі карыстацца толькі багажом мінулых ведаў, новыя нейронавыя сувязі не ўтвараюцца. У выніку пагаршаюцца працэсы ўспрымання, мыслення, знікае цікавасць да жыцця, парушаецца сацыялізацыя, зніжаецца здольнасць да навучання. Пажылыя людзі становяцца больш асцярожнымі, эгацэнтрычнымі, кансерватыўнымі, ім складаней адаптавацца да зменлівага свету. Новыя тэхналогіі часам выклікаюць у іх адчуванне ўласнай бездапаможнасці, зніжаюць самаацэнку і, як вынік, вядуць да агрэсіі, адмаўлення прагрэсу. Безумоўна, усё гэта адлюстроўваецца на якасці камунікацыі з унукамі. Бабулі і дзядулі часта раздражняюцца не разумеючы, чаму дзеці, падлеткі, моладзь столькі часу праводзяць у смартфоне. Такія паводзіны не ўкладаюцца ў іх карціну свету, якая прынцыпова адрозніваецца ад іх вопыту. Ім складана часам зразумець, што гаджэты — яшчэ адзін інструмент пазнання свету, а інтэрнэт нярэдка кампенсуе ўнукам той дэфіцыт жывых зносін, які яны адчуваюць у рэальным жыцці.

***— Гэта значыць, зацікаўленыя ў захаванні добрых зносін з унукамі бабулі і дзядулі павінны прыкладаць намаганні і асвойваць інфармацыйныя тэхналогіі?***

— Безумоўна. І не толькі па гэтай прычыне. Для прафілактыкі дэменцыі, захавання псіхічнага здароўя мозгу абавязкова трэба даваць кагнітыўную нагрузку: вывучаць замежную мову, займацца творчасцю, асвойваць новыя прафесіі. Каб пажылым захацелася аваладаць новымі інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі, важна паказаць іх перавагі: як, не выходзячы з дому, заказаць дастаўку прадуктаў ці лекаў, аплаціць камунальныя паслугі і г. д. Вельмі важная матывацыя для асваення гаджэтаў — навучыцца гаварыць з унукамі на адной мове, быць у курсе таго, якую інфармацыю яны спажываюць. Віртуальная рэальнасць нясе шэраг небяспек. Дзеці і падлеткі, напрыклад, любяць відэаблогі. Але сярод іх ёсць вельмі шкодныя (напрыклад, блогі-«забівы»), якія здольны траўміраваць неакрэплую псіхіку. «Адукаваным» бабулям і дзядулям прасцей адсочваць, чым «падсілкоўваюцца» іх унукі. Яны могуць разам абмеркаваць убачанае, растлумачыць, што «такое добра і што такое дрэнна», чаму варта верыць, а чаму — не. Патрэбна цікавіцца гульнямі, якімі захапляюцца ўнукі, сацсеткамі, іншымі магчымасцямі віртуальнай прасторы.

***— Хто больш паспяхова навучае пажылых новаму — аднагодкі або ўнукі?***

— На гэты конт ёсць розныя меркаванні. Шэраг спецыялістаў лічаць больш эфектыўным спосаб, калі роўны навучае роўнага. У еўрапейскіх універсітэтах трэцяга ўзросту выкладаюць пераважна равеснікі пажылых «вучняў». Аргументы на карысць такога падыходу: прадстаўнікі аднаго пакалення лепш разумеюць адзін аднаго, паколькі ў іх агульны вопыт, каштоўнасці. Прасунутыя равеснікі-настаўнікі самі па сабе як стымул верыць: узрост — не перашкода для аваладання новымі ведамі і навыкамі, пры жаданні ўсё атрымаецца.

Але, з іншага боку, у некаторых слухачоў побач з педагогам-равеснікам уключаецца «ўнутраны крытык», які тармозіць навучанне. Часта самі пажылыя прызнаюцца, што аддаюць перавагу маладым: яны лепш тлумачаць, зараджаюць энергіяй, энтузіязмам, лягчэй ставяцца да памылак. Супрацiўленне менш, а навучанне ідзе весялей і хутчэй.

***— Якія асаблівасці адрозніваюць пакаленне сучасных унукаў? Што важна разумець пра іх, каб правільна, прадукцыйна будаваць адносіны?***

— Ёсць цікавая тэорыя пакаленняў, якую сфармулявалі ў пачатку 1990-х амерыканцы Уільям Штраус і Ніл Хау. Згодна з ёй, сучасныя ўнукі адносяцца да пакаленняў Y (інтэрнэт-пакаленне, міленіялы), Z (2000—2009) і Альфа (2010—2024).

Спынюся на пакаленні Альфа, на якое з-за ўзросту яшчэ можна ўплываць і дапамагаць гарманічна фарміравацца. Альфа — гэта супер-дзеці: яны нараджаюцца з гаджэтамі ў руках, жывуць у лічбавым свеце. Дакладнай інфармацыі пра іх вельмі мала, але заўважана, што яны праяўляюць павышаную цікавасць да самаадукацыі, бяруць веды адусюль. Група беларускіх псіхолагаў на працягу трох гадоў назірала за дзецьмі малодшага школьнага ўзросту (6—10 гадоў), вывучала ўплыў лічбавых тэхналогій на іх паводзіны і ўяўленне пра сябе.

Некаторыя адкрыцці аказаліся не вельмі прыемнымі. Напрыклад, мы выявілі ў дзяцей праваллы ў фарміраванні сацыяльных адносін «я + сям'я» і «я + сябры». Падобна на тое, што ім хочацца паўней адчуваць сябе сынамі і дочкамі, атрымліваць і дарыць іншым больш клопату, увагі, удзелу. У адказах сучасных дзяцей адчуваецца прыхаваная туга па глыбокіх адносінах з бацькамі. І хоць у нашай культуры сям'я — вялікая каштоўнасць, у дзяцей чамусьці не фарміруецца яснага ўяўлення: як быць сынам ці дачкой, сястрой ці братам, унукам ці ўнучкай. Ясна, што сёння адносіны «чалавек — машына», «чалавек — тэхніка» развіваюцца больш імкліва, чым «чалавек — чалавек».

***— І якую выснову з гэтага павінны зрабіць дарослыя? Чаму трэба ўдзяліць асаблівую ўвагу, каб пакаленне Альфа стала не толькі разумным, але яшчэ і добрым, і шчаслівым?***

— Сям'я важнейшая за гаджэты, а сапраўдны, рэальны сябар — лепш, чым віртуальны. Трэба больш актыўна прапагандаваць сямейныя, агульначалавечыя каштоўнасці. Перш за ўсё гэта місія бацькоў. Але і бабулі з дзядулямі — выдатныя памочнікі і настаўнікі. Шчырая ўвага да сваякоў і сяброў, цікавасць, клопат пра іх, уменне канструктыўна вырашаць канфлікты і не разрываць адносіны, радавацца і гараваць як у адзіноце, так і разам — гэта вельмі важныя ўрокі, якія могуць і павінны даць Альфа-пакаленню дарослыя. Абавязкова трэба арганізоўваць з імі гульні, у якіх патрабуюцца рэальныя веды, уменні, навыкі; спаборніцтвы з прызамі, узнагародамі, у выніку якіх можна навучыць дзіця гатаваць, майстраваць, прыбіраць. Падчас гульняў, сумеснай дзейнасці бабулі і дзядулі зближаюцца з унукамі, лепш разумеюць адзін аднаго. Таксама сучасных дзяцей і падлеткаў трэба часцей вывозіць на прыроду. Нават малых важна браць з сабой на пікнікі, у госці, каб дзеці насычаліся эмацыянальнымі ўражаннямі, атрымлівалі разнастайныя сэнсарныя і сацыяльны вопыт. Спевы птушак, подых ветру, водар кветак, смак ягад, сарваных у лесе, сумеснае чаяванне ў садзе са смехам і жартамі — усё гэта неабходна для паўнавартаснага развіцця нашчадкаў.

**Гутарыла Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

# Людміла і Вячаслаў СЯРГЕЕВЫ: шматдзетныя бацькі аднаго спартсмена

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Усе сем'і ў нашым спорце пачыналіся ў юнацтве, калі мы яшчэ самі трэніраваліся і выступалі як спартсмены. Мы знаёміліся, разам раслі, і некаторыя стваралі сем'і, разам заканчвалі спартыўныя кар'еры, пачыналі трэнерскія. Многія з нас займаліся канькабежным спортам. А калі стала больш пляцовак для шорт-трэку і ўзнікла патрэба ў развіцці гэтага віду спорту, мы актыўна ўзяліся, — раскрывае сакрэт «сямейнасці» шорт-трэку Людміла Сяргеева.

***— Існуе меркаванне: калі пара займаецца адной справай, гэта можа нашкодзіць адносінам. Што вы аб гэтым думаеце?***

**Людміла:** — Я лічу, што гэта міф. Для мяне работа разам з мужам — найлепшае, што можа быць. І яна ніяк не ўплывае на адносіны. Адзіны мінус — мы знаходзімся на працы 24 гадзіны ў суткі. Як бы ты ні хацеў разгрузіцца, адпачыць псіхалагічна, дома ўсё роўна думаеш пра работу, абмяркоўваеш. І яна «пераносіцца» дадому. Зразумела, у такіх абставінах да гэтай дзейнасці далучаюцца і дзеці. Наш Максім даваў інтэрв'ю перад Алімпійскімі гульнямі ў Сочы, і ў яго спыталі, як ён трапіў у шорт-трэк. «А ў мяне не было іншага выбару», — адказаў ён. І гэта зразумела: мама, тата пастаянна на рабоце і сын разам з імі на катку.

***— Атрымліваецца, плюсоў у сумеснай рабоце значна больш, чым мінусаў?***

**Людміла:** — Канешне, больш. Самае галоўнае — побач ёсць чалавек, якому я магу на 100 працэнтаў давяраць і з якім магу раздзяліць усе рабочыя радасці і цяжкасці. Я хацела стварыць адзіную каманду трэнераў і спартсменаў, разам дасягаць агульных мэт. Але з'явіліся рознагалоссі з калегамі, і мая ідэя не ажыццявілася. З мужам такога не ўзнікне, бо ён будзе падтрымліваць усе мае погляды і ідэі. Мне здаецца, было б цяжка, калі б мой муж быў заняты ў іншай сферы. Не кожны мужчына зразумее, калі жонка пастаянна на рабоце, на зборах, спаборніцтвах і не заўсёды можа згатаваць вячэру, прыбраць дома. А так мы разам жывём у адным рытме. Муж разумее спецыфіку спартыўнай працы, плюсы і мінусы. Вядома, у нас здараюцца канфлікты, спрэчкі, у кожнага можа быць адрознае бачанне. Але я больш спакойная і памяркоўная, а Вячаслаў — больш эмацыянальны, таму мы адзін аднаго дапаўняем.

**Вячаслаў:** — На мой погляд, калі людзі працуюць у розных сферах, кожны заняты сваімі клопатамі, сканцэнтраваны на іх. Ад гэтага часам можа ўзнікнуць нейкае саперніцтва, непаразуменні. А калі людзі звязаны агульным інтарэсам, адной справай, ніякага саперніцтва не можа быць. Так, у нас адзін від дзейнасці, але ў кожнага ёсць свае абавязкі, яны падзелены вельмі дакладна. У гэтым годзе будзе 34 гады, як мы разам, з іх больш за 20 мы трэнеры. Мне здаецца, гэта паказчык паспяховасці нашага сямейнага тандэму.

***— А як да вашага сямейнага тандэму ставяцца калегі?***

**Людміла:** — Вельмі многім гэта не падабаецца. Спачатку я не звяртала ўвагі, а потым стала раздражняцца. Напрыклад, мяне запрасілі дапамагчы ў падрыхтоўцы нацыянальнай каманды да алімпійскага адбору. Я хацела стварыць, перш за ўсё, моцную каманду спартсменаў і каманду трэнераў, аб'яднаць трэнерскі штаб. І планавала, што членам трэнерскай каманды стане Вячаслаў. Ён працаваў з юніёрскай камандай Расіі, спартсмены якой займалі высокія месцы на чэмпіянатах свету і зараз уваходзяць у асноўны састаў расійскай нацыянальнай каманды. Гэта не старонні чалавек, а вопытны спецыяліст. І гэта той, каму я магу давяраць і хто будзе мяне падтрымліваць. Але нам не далі папрацаваць разам. Прычына — «ён ваш муж, і вы будзеце яго прасоўваць». Але пры чым тут прозвішча — гэты спецыяліст патрэбны для ажыццяўлення агульных задач!



Вячаслаў СЯРГЕЕЎ з вучнямі.

**Вячаслаў:** — Нармальная практыка — калі кожны спецыяліст у камандзе выконвае свае абавязкі. Такое прадузятае стаўленне да нашай сям'і пачалося яшчэ падчас падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў у Сочы. Наш сын Максім шмат працаваў, добра выступаў на спаборніцтвах і заваяваў ліцэнзію на алімпіяду. Яна была неймавернай, таму праходзіў дамашні адбор. Ён на ім стаў найлепшым, канчаткова адабраўся ў Сочы. А ў адказ: «Гэта ваш сын, вы яго цягнеце!» А як мы можам яго цягнуць, калі спартсмен сам трэніраваўся, выступаў, заваяваў ліцэнзію? І з таго часу пачалося: «Вы сям'я, вы адзін аднаго цягнеце».

***— Максім Сяргееў — першы беларускі спартсмен, які выступіў на алімпійскіх спаборніцтвах у шорт-трэку. Грандыёзная падзея не толькі для трэнераў, але і для бацькоў...***

**Людміла:** — Для ўсяго беларускага шорт-трэку. Пасля таго, як Максім заваяваў ліцэнзію ў Сочы, да нас сталі прыслухоўвацца, нас сталі падтрымліваць. На жаль, не атрымалася заваяваць медалі. Але для гэтага патрэбны асаблівыя ўмовы і вялізныя грашовыя сродкі. А мы заўжды працавалі ў Беларусі, на родным канькабежным стадыёне, і былі як на далоні.

***— Чым Максім займаецца пасля завяршэння кар'еры?***

**Людміла:** — Ён малайчына, застаўся ў спорце, хоць і ў новым кірунку. Максім зараз працуе фітнес-інструктарам, прымяняе гэтыя веды ў розных відах спорту. Ён даўно гэтым цікавіўся, чытаў літаратуру, развіваўся. Разам з Беларускім саюзам канькабежцаў мы яго папрасілі вярнуцца на лёд. І зараз ён два разы на тыдзень займаецца з дзецьмі. Максіму гэта падабаецца, у яго шмат вопыту, які будзе карысны маладым шорт-трэкістам.

***— Людміла Андрэеўна, а як вам удавалася пераключацца з ролі мамы на ролю трэнера?***

— Гэта быў самы цяжкі момант у працы з Максімам. Калі мне кажуць, што я свайго сына «прасоўвала», што ставілася да яго не так, як да іншых спартсменаў, я пытаюся: «Як бы адчувалі сябе гэтыя людзі, кожны дзень даючы свайму дзіцяці каласальныя нагрузкі?» Ніхто не хоча ўяўляць, як гэта — мацярынскім сэрцам адчуваць, што ты нагружаеш свайго сына. Можа, часам мяне гэта спыняла, і ўсім спартсменам было лягчэй.



Людміла СЯРГЕЕВА.

Калі спартсмен жорстка трэніруецца, ён знаходзіцца ў цяжкім псіхалагічным стане. Усе спартсмены на піку формы становяцца раздражняльнымі, нервовымі. І Максім гэты негатыў скідваў на нас. Мы ўспрымалі ўсё вельмі блізка да сэрца. Як не перажываць, калі ад роднага сына ідзе негатыў? Але мы пагаварылі, і ён сказаў, каб мы не турбаваліся, бо так ён спрабуе разрадзіцца. Іншыя спартсмены такой магчымасці не маюць.

> **«Калі мне кажуць, што я свайго сына "прасоўвала", што ставілася да яго не так, як да іншых спартсменаў, я пытаюся: "Як бы адчувалі сябе гэтыя людзі, кожны дзень даючы свайму дзіцяці каласальныя нагрузкі?»**

І Максіму было нялёгка. Да яго патрабаванні заўсёды былі вышэйшыя, чым да іншых.

***— Можа, гэта і прывяло яго да такіх вынікаў?***

**Вячаслаў:** — У Максіма найлепшы вынік у кар'еры — 12-е месца на чэмпіянаце Еўропы. Пасля другой алімпіяды была парушана праграма падрыхтоўкі, нас пазбавілі ўмоў, у якіх мы працавалі. І Максім перастаў бачыць сэнс у далейшых трэніроўках. Мы разумелі, што ён яшчэ многага можа дасягнуць, але перашкодзілі менавіта арганізацыйныя моманты.

**Людміла:** — Максім скончыў кар'еру ў 27 гадоў, найлепшы ўзрост для шорт-трэкіста. Мы вельмі перажывалі, бо бачылі, што ён яшчэ можа выступаць. Але ў новых умовах ён не мог ісці далей. Важна, каб спартсмен сыходзіў рэалізаваны, дасягнуўшы жаданага. Гэта, мабыць, датычыцца любой дзейнасці. Адчуванне, што ты чагосьці не дарабіў, «вісіць» у галаве. Максім нас супакоіў, упэўніў, што сваёй спартыўнай кар'ерай ён задаволены. У тых умовах, у якіх ён працаваў, мы дасягнулі максімуму. У шорт-трэку павінна быць каманда аднолькава моцных спартсменаў, якія разам трэніруюцца. А ў нас пасля Алімпійскіх гульняў — 2018 года засталіся толькі Максім Сяргееў і Яўген Рыжоў, яны разам і скончылі кар'еру.

***— Улічваючы ваш багаты вопыт, вас можна назваць шматдзетнымі бацькамі.***

**Вячаслаў:** — Можна і так сказаць. Калі мы працавалі ў Віцебску, у нас былі спартсмены розных узростаў. І бацькі казалі, што мы іх дзяцей бачым часцей. Тры тыдні дзеці на зборах з намі, тыдзень — з бацькамі дома.

**Людміла:** — Мяне радуе, што з многімі нашымі вучнямі мы і цяпер падтрымліваем добрыя адносіны. Адзінае, што хвалюе, — не так шмат людзей пасля завяршэння кар'еры застаюцца ў шорт-трэку. Нават Максім сказаў: "Я хачу адпачыць галавой і ўбачыць штосьці новае». І я яго разумею.

***— Якія сямейныя традыцыі ёсць у сям'і Сяргеевых?***

**Вячаслаў:** — У нас не хапае на іх часу. Мы нават у адпачынку не бываем. Сезон скончыўся, парабілі ўсе справы, і ўжо новы сезон пачынаецца.

**Людміла:** — Сапраўды, наша бяда ў тым, што мы не маем вольнага часу, які можам прысвяціць сабе. У нас у абодвух пажылыя бацькі, наведваем іх. Максім часам нас кудысьці возіць, каб мы адпачылі. І вось такімі момантамі мы вельмі даражым, яны самыя важныя і самыя каштоўныя. У нас была «традыцыя» — хацець завесці сабаку. Але наш лад жыцця гэтага не дазваляў, бо мы пастаянна ў раз'ездах. А зараз Жэня Рыжоў, наш вучань і сябар Максіма, пераехаў у іншы горад і пакінуў нам рыжага шпіца. І ў самы складаны час сабачка нас ратаваў, дапамагаў псіхалагічна разгрузіцца.

***— У чым сакрэт вашага сямейнага і працоўнага шчасця?***

**Людміла:** — Галоўны сакрэт — гэта давер. Муж — адзіны чалавек, якому я поўнасцю давяраю і магу расказаць усе свае думкі і праблемы, нічога не ўтойваючы. І я ведаю, што ён зразумее. І, вядома, куды без кахання? З яго ж усё пачынаецца.

**Вячаслаў:** — Для мяне галоўнае — знайсці падыход да чалавека і ўсюды быць разам — так і лягчэй, і весялей.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Факт

## Прыярытэт — сям'я і дзеці

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч правяла сустрэчу з прадстаўніком ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь спадарыняй Таняй Радачай. У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся пытанні двухбаковага супрацоўніцтва.**

Мінпрацы і сацабароны цесна ўзаемадзейнічае з Прадстаўніцтвам ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь па пытаннях сямейнай палітыкі, аказання сацыяльных паслуг дзецям з інваліднасцю і маладым інвалідам, рэалізацыі правоў дзяцей-інвалідаў.

Бакі пацвердзілі дамоўленасці аб працягу ўзаемадзеяння ў рамках рэалізацыі новай Краінавай праграмы супрацоўніцтва ўрада Рэспублікі Беларусь і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) на 2021—2025 гады, выканання мерапрыемстваў падпраграмы «Сям'я і дзяцінства» Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека на 2021—2025 гады», рэалізацыі мерапрыемстваў Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2021—2025 гады. Кірункі двухбаковага супрацоўніцтва і канкрэтныя мерапрыемствы знойдуць адлюстраванне ў плане сумеснай работы на 2021 год. Прыярытэтнымі тэмамі ўзаемадзеяння вызначаны сямейная палітыка і пытанні дэінстытуалізацыі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Сваімі рукамі

# ОХ УЖО ГЭТАЯ НАСЦЯ!

## Мінчанка піша партрэты раслін і стварае «бансай для бедных»

**Апошнім часам захапленне пакаёвымі раслінамі для многіх становіцца модным хобі, якое нярэдка перарастае ў штосьці большае. Мінчанка Анастасія ЧАРТОВІЧ, інжынер па спецыяльнасці, не толькі разводзіць дома кветкі, але і робіць так званую какедаму, малюе сваіх зялёных гадаванцаў акварэллю, ствараючы ў кватэры адмысловы «жывы» інтэр'ер.**



Усё пачалося з таго, што ў нейкі момант работа ў офісе дзяўчыне надакучыла, і яна задумалася, што ж ёй сапраўды даспадобы. Пачала прыглядацца да «кветкавых» вакансій, бо з дзяцінства любіла ўсё жывое. Для работы фларыстам, апроч досведу па вырошчванні раслін, патрэбны былі і веды па доглядзе за зрэзанымі кветкамі, стварэнні кветачных кампазіцый і букетаў. Анастасія прайшла інтэнсіўны курс па фларыстыцы і на працягу года паспела папрацаваць у розных фларыстычных салонах. І хоць потым дзяўчына вярнулася ў офіс, гэты вопыт аказаўся для яе бясцэнным. З'явілася галоўнае — жаданне ствараць нешта сваё і рухацца далей.

Кветачніца стварыла сваю старонку ў Instagram (https://www.instagram.com/kvetki.doma), дзе дзеліцца парадамі па доглядзе за раслінамі. Спачатку ў яе не ўсё атрымлівалася, бо кожнай расліне, апроч пяшчоты, неабходныя яшчэ і пэўны догляд, і мікраклімат. Па артыкулах з інтэрнэту і кніг не заўсёды зразумела, якая кветка будзе расці дома, а якая — не, на што варта звяртаць асаблівую ўвагу. Так, у пошуках праўды, Насця трапіла на семінар па гаршковых раслінах, дзе і пазнаёмілася з тэхнікай па стварэнні какедамы.

— Я не стаўлю мэту стварыць дома джунглі, ды і ва ўмовах кватэры, каб іх вырасціць, трэба вельмі паклапаціцца, бо кожнай жывой істоце патрэбныя свае асяроддзе і ўвага. Вось, напрыклад, папаратнік за тыдзень можа знікнуць, калі паветра ў памяшканні сухое, але, ведаючы гэта, я ўсё адно набыла сабе адзін (*смяецца*). Цяпер спрабую зрабіць так, каб ён жыў, — проста люблю эксперыментаваць. Мне спадабалася ідэя вырошчвання раслін у какедаме — земляным шары. У Японіі гэты спосаб завуць «бансай для бедных», бо ў класічнага бансай больш складаная тэхналогія вырошчвання, патрэбны спецыяльныя інструменты, кашпо.

Дзяўчына кажа, што спосаб стварэння такіх земляных шарыкаў даволі просты, але патрабуе часу і фізічнай сілы, затое не трэба падбіраць гаршчок. Галоўнае — уважліва падбраць кветкі: вільгацелюбівыя і ценяўстойлівыя (да такіх можна аднесці, напрыклад, большасць ароідных). Шарык складаецца са спецыфічнага грунту, лёгкага, «дыхаючага», які пакрываюць пластом імху —1,5-2 см (для ўтрымання вільгаці), замацоўваюць ніткамі. Паводле слоў Анастасіі, расце ў такой «штучцы» ўсё выдатна.

— Субстрат для какедамы я раблю сама. У яго ўваходзяць глеба, перліт для рыхласці, можна дадаць крыху драўнянага вугалю, каб расліна лепш сябе адчувала, патрэбны яшчэ торф «Кета», які ў нас не прадаюць — замест яго выкарыстоўваю чорную гліну. Такі грунт быццам «дыхае», ён забірае лішнюю вільгаць і паступова «аддае» яе расліне. Усе кампаненты змешваюцца ў патрэбных прапорцыях, атрымліваецца своеасаблівае цеста з зямлі. Лепіцца шарык, у які змяшчаецца расліна з карэньчыкамі. Кветка ў такім «шарыку» расце павольна, паліваецца з дапамогай апускання ў ёмістасць з вадой на 15—20 хвілін. Потым какедаму трэба адціснуць, паставіць на паддон, каб вада сцякла. Першы такі паліў ажыццяўляецца адразу пасля стварэння какедамы, а наступны — прыкладна праз тыдзень. Паступова трэба прывучаць свайго зялёнага гадаванца да рэдкіх палівaў — раз на два тыдні.

У такой «экзотыкі», запэўнівае дзяўчына, шмат плюсоў: адпадае пытанне падбору гаршка, какедама арганічна глядзіцца ў інтэр'еры, а таксама гэта знаходка для тых, хто забывае паліваць свае кветкі!



Для сваёй дамашняй калекцыі, а гэта каля 50 відаў раслін, Насця набывае кветкі па-рознаму — часам бярэ парасткі на рабоце, часам у сяброў, нешта купляе на «Куфары» і ў крамах. Яна падзялілася, што апошнім часам ёсць тэндэнцыя вырошчваць «бабуліны» кветкі — сансевіерыю («Шчупаковы хвост»), герань, традэсканцыю, хедэру (плюшч) і г. д., а таксама на «экзотыку». У гераіні матэрыялу ёсць увесь «бабулін» набор. Дарэчы, у забабоны, звязаныя з некаторымі відамі, дзяўчына не верыць.

— Лічу, што расліны, як усе жывыя істоты, валодаюць сваім энергетычным полем, але чалавек галоўны ў гэтых стасунках (*смяецца*).

Настассі цікава абменьвацца пакаёвымі ўлюбёнцамі на розных інтэрнэт-платформах, глядзець, што ёсць у іншых кветкаводаў, папаўняць сваю калекцыю ці дзяліцца кветкамі, напрыклад, на Instagram-старонцы Бібліятэкі раслін.

**Лепіцца шарык, у які змяшчаецца расліна з карэньчыкамі. Кветка ў такім «шарыку» расце павольна, паліваецца з дапамогай апускання ў ёмістасць з вадой на 15—20 хвілін.**

Чарговым захапленнем дзяўчыны-батаніка нядаўна стала маляванне. Пару гадоў таму яна знайшла час для ўвасаблення даўняй мары: на курсах паспрабавала маляваць рознымі матэрыяламі — алоўкам, алеем, акварэллю.

— Мінулым летам у адпачынак ездзіла на Нарач, а там лясы такія багатыя, прыгажосць! Шмат розных кветак расце. Рабіла з іх букеты і для сябе, і ў падарунак. Калі ішоў дождж, заставалася ў нумары гасцініцы і малявала кветкі. Потым нейк купіла кнігу пра расліны «Urban Jungle», дзе шмат замалёвак, добра расказваецца пра кветкі ў інтэр'еры, дызайн. Звярнула ўвагу, што вельмі цікава глядзяцца расліны разам з «кветкавымі» постарамі, карцінамі. І сапраўды — там, дзе раслінам цёмна, акварэльным «партрэтам» кветак выдатна. Пару жывых раслін — а побач карціна з «віртуальным» гадаванцам — і ў вас ужо аранжарэя! І гэта натхніла на стварэнне батанічных акварэляў.

На пытанне, як жа змяшчаецца ўсё гэта ў аднапакаёўцы, Настасся толькі ўсміхаецца: нешта расце на падаконні, нешта — на падлозе, нешта — у глыбіні пакоя, штосьці — у падвесных кашпо, якія яна сама вяжа. «Так, магу і кашпо плесці, і букеты складаць, і кампазіцыі рабіць, але імкнуся «не распыляцца» — выбіраю тое, што больш даспадобы і менш энергазатратна».

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з асабістага архіва гераіні.**

Нататкі шматдзетнага таткі

# У КАГО БЫЎ БЫ БОЛЬШЫ ШОК?



Неяк я чытаў кніжку па астрафізіцы (спрабую не адставаць ад сына), напісаную вядомымі амерыканскімі прафесарамі спецыяльна для студэнтаў-гуманітарыяў. Пасля гэтага ў нас адбылася душэўная гутарка з сынам на прадмет магчымасці падарожжаў у часе: ён мне даказваў, што навуцы гэта не супярэчыць, а я яму як гуманітарый, які кіруецца ў першую чаргу цвярозым сэнсам, а не навуковай бязглуздзіцай, тлумачыў, што гэта немагчыма.

А ўчора я ў яго спытаў:

— Як думаеш, калі б цябе адправіць на перавыхаванне ў маё дзяцінства, у васьмідзясятыя гады XX стагоддзя, а мяне адтуль ненадоўга закінуць у сённяшні час, у каго быў бы большы шок?

Сын падумаў і сказаў:

— Думаю, у цябе.

— Чаму?

— Таму што я пра той час хоць штосьці ведаю, а ты пра будучыню нічога тады не ведаў.

І я ўявіў сабе гэту карціну: трапляю я з 80-х гадоў мінулага стагоддзя наўпрост у дваццатыя гады стагоддзя цяперашняга. Першы тыдзень, зразумела, адчуваю некультурны шок: асабліва ўражваюць цуда-смартфоны, колькасць машын на дарогах (праўда, яны чамусьці не лятаюць) і багацце прадуктаў і адзення ў крамах. Праз тыдзень-другі я да ўсяго гэтага прывыкаю, асвойваюся ў новай рэчаіснасці, а праз месяц карыстаюся смартфонам не горш за сябе сённяшняга.

А цяпер уявім майго сына ў маім дзяцінстве — у свеце без мабільных тэлефонаў, інтэрнэту, сучасных аўтамабіляў, прыгожага адзення і далікатэсаў. У свеце, дзе па тэлевізары ідуць толькі тры каналы, і тыя чорна-белыя, а ў кожным школьным класе вісіць партрэт Ульянава-Леніна. І нават знайсці нармальную кнігу вельмі праблематычна. Таму з усіх забаў у дзіцяці застаецца толькі адна (затое якая!): двор.

І ў гэтым самым двары кіпіць-бурліць жыццё: ёсць тут свае аўтарытэты, тайныя правілы-ўяўленні, свая іерархія каштоўнасцяў. Савецкі двор нават у большай ступені, чым сям'я, быў месцам выхавання чалавека, і не самага горшага выхавання, трэба сказаць. У двары цябе вучылі думаць, перш чым гаварыць (праўда, не ўсіх навучылі, на жаль), і адказваць за свае словы.

Мы не сядзелі суткамі напралёт у інтэрнэце, затое самі прыдумвалі сабе забавы і гульні, спазнаючы свет рэальны, а не віртуальны. У нашым дзяцінстве было значна больш таго, што сёння прынята называць крэатывам: у мяне да гэтага часу стаіць перад вачыма мужык, які нёс дадому нейкія дошкі, але так і не данёс. Таму што мы папрасілі «дзядзечку» падбіць мяч. А мяч, трэба сказаць, быў не просты, а з начынкай з цэглы.

Таму, мне здаецца (не, я абсалютна ўпэўнены!), што значна больш быў бы шакаваны сучасны падлетак, калі б ён трапіў у рэаліі нашага дзяцінства. Затое, прабыўшы там нейкі час, не факт, што ён захацеў бы вярнуцца назад: дваровае жыццё, ведаеце, зацягвае.

Гэта можа пацвердзіць мой французскі пляменнік (з самага Парыжа), які гасцяваў у мяне ў той далёкі час: ён і цяпер успамінае мінскі мікрараён Зялёны Луг як самае яркае ўражанне дзяцінства: як мы ўзрывалі ў лесе ўзрыўпакеты, гулялі ў «Сляпога ката» на лесвічнай клетцы, па вечарах грукалі бульбачкай, падвешанай за нітку на даху, па вокнах шматпавярхоўкаў і адлівалі на вогнішчы свінцовыя чушкі для надання моцы кулаку.

І вы думаеце, што пасля такога дзіўнага досведу сучасны падлетак захацеў бы вярнуцца ў нашы дні і зноў завіснуць «УКантакце»? Наўрад ці.

Таму, можа, яно і да лепшага, што падарожжы ў часе немагчымыя (з пункту гледжання гуманітарыя): калі б кожны сам выбіраў сабе, у якім часе жыць, гэта які б бардак настаў на планеце! Тым больш што ў кожным часе абавязкова ёсць свае плюсы і мінусы. І галоўнае — навучыцца цаніць плюсы і па магчымасці абыходзіць бокам мінусы.

* * *

Сын:

— Тата, я табе дам сто рублёў, перавядзі мне на карту таксама сто.

(*Па-мойму, другая частка фразы была лішняя.*)

Я:

— А адкуль у цябе сто рублёў?

— У сэнсе адкуль? Якая розніца?

— Ну, можа, ты праз мяне вырашыў «адмыць» непрацоўныя даходы.

Жонка:

— Не палохай дзіця, гэта прызавыя за перамогу ў рэспубліканскім турніры фізікаў. Так, Арсеній?

— Угу.

(*Вось што значыць мама: заўсёды знойдзе апраўданне для дзіцяці!*)

Карацей, усё больш сур'ёзна, чым я думаў. Тата — гэта ўжо фінальная стадыя працэсу. Спачатку фінансавыя патокі размяркоўваюцца праз нейкі «турнір юных фізікаў» (відаць, той самы, на які бацькі здаюць грошы).

Я, канешне, грошы пераавёў: сын усё ж. Але замест ста рублёў паклаў дзевяноста пяць — каб фізікі не забывалі: гуманітарыі таксама людзі і павінны неяк жыць. А ўвогуле схема выдатная: калі з фізікай раптам не складзецца, дзеці не прападуць.

***P. S.*** У гэтай схеме адзін істотны недахоп: без гуманітарыяў не працуе. Як, зрэшты, і ўся астатняя фізіка.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «Щучинский ремонтный завод», Гродненская обл., Щучинский р-н, а.г. Рожанка, ул. Советская, 52А** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 – производственная база**
**Адрес: Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, п. Рожанка, ул. Вокзальная, 18**

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Здание трансформаторной подстанции ЗТП-Щ-47** (здание специализир. энергетики) | 38,6 кв. м | 422/С-65353 | 12Б |
| **Проходная** (здание специализир. иного назначения) | 21,1 кв. м | 422/С-3362 | д. 18А |
| **Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 89,2 кв. м | 422/С-3363 | д. 18Б |
| Здания административно-хозяйственные: | | | |
| **Контора** | 201,8 кв. м | 422/С-3361 | д. 18 |
| Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка | | | |
| **Контора нефтебазы** | 105,5 кв. м | 422/С-15365 | 18, корп. 7 |
| Здания специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ: | | | |
| **Арочный склад** | 847,1 кв. м | 422/С-3365 | д. 18В |
| **Склад хозтоваров и стройматериалов** | 1127,7 кв. м | 422/С-3366 | д. 18Г |
| **Склад запасных частей автомобилей и сельскохозяйственных машин** | 1128,5 кв. м | 422/С-15363 | д. 18Е |
| **Склад металлометизовый** | 1113,2 кв. м | 422/С-15362 | д. 18Д |
| Здание специализир. для ремонта и технич. обслуживания автомобилей (в т.ч. автомоб. заправочные и газонаполнительные станции: | | | |
| **Механический цех** | 899,3 кв. м | 422/С-3364 | д. 18Ж |
| Составные части и принадлежности: блочная пристройка | | | |
| **Сооружение благоустройства** (сооружение неустан. назначения) | 27813,4 кв. м | 422/С-64993 | д. 18 |
| Составные части и принадлежности: бордюр, смотровая вышка, подкрановая площадка, тротуар для подъезда к складу, асфальтная площадка, дорога подъездная с площадкой, площадка железобетонная, ограждения, цветник, подпорная стена, резервуар | | | |

***Сведения о земельных участках*** – предоставлены продавцу на праве постоянного пользования: пл. **0,0083 га** – для обслуживания здания трансформаторной подстанции Щ-47 и пл. **8,7065 га** – для содержания и обслуживания производственно-торговой базы. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны линий электропередачи, пл. 0,0824 га

***Обременения***: частичная аренда. Подробнее на сайте организатора аукциона

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 1 089 067,63 бел. руб.**

**Лот № 2 – оборудование, бывшее в употреблении**
**Месторасположение: Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, п. Рожанка, ул. Вокзальная, 18**

**Кран козловой 2-консольный КК-10-25** (с грузовой крановой тележкой и электроталью со стропами; грузоподъемность 10 т), 1974 г. в., инв. номер 561

| | |
|---|---|
| **Условия самовывоза и демонтажа** | Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона |

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 67 860,00 бел. руб.**

**Задаток по лоту № 1 – 5 %, по лоту № 2 – 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 12.00 06.05.2021.**<br>**Окончание торгов: 13.00 06.05.2021.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.05.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:**
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-7508 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин) общей площадью 956,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129622 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть) протяженностью 24,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, тепловая сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129623 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 57,6 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129625 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 190,3 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129624 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 159,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129627 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 26,8 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;
- сеть энергоснабжения;
- оборудование: вагончик строительный, комплект регулирования температуры, набор мебели, насос «Грунфос» УРС24*40, охранно-пожарная сигнализация, павильон из металлоконструкций, регулятор распределения тепловой энергии, регулятор расхода теплоэнергии МИР 9701, система видеонаблюдения, система пожарной сигнализации.

Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц в виде аренды с собственниками павильонов и мест для торговли

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000002000488 площадью 0,8688 га (назначение – эксплуатация и обслуживание Грандичского рынка), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55

Начальная цена продажи – 4 659 480 руб. (четыре миллиона шестьсот пятьдесят девять тысяч четыреста восемьдесят рублей) с учетом НДС

